Факультэт
гуманітарыстыкі
і моўных камунікацый

# ЛІТАРАТУРНЫ AUTOGRAPHUM

*Здароў, марозны, звонкі вечар!*
*Здароў, скрыпучы, мяккі снег!*

Максім Багдановіч

№ 5
ЗІМА
2023



# АД ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА



## *Шаноўныя філолагі, паважаныя аўтары і проста ўсе неабыякавыя чытачы!*

Прапануем Вашай увазе пяты (зімовы) нумар студэнцкага літаратурнага часопіса **«ЛІТАРАТУРНЫ AUTOGRAPHUM»**, які выходзіць у электронным фармаце.

У гэтым нумары прадстаўлены як традыцыйныя, так і новыя рубрыкі. Чытайце ў пастаяннай рубрыцы «Паэзія»: студэнткі ФГіМку розных спецыяльнасцяў Даніэла Горына, Анастасія Шчаглова і Віялета Кірылава падзяліліся сваімі пачуццямі і думкамі праз вершаваныя радкі. У рубрыцы «Ад карэспандэнта» выкладчыкі ФГіМК змястоўна расказалі пра свае захапленні. У гэтым нумары таксама можна пазнаёміцца з казкай «Снежная, снегавая» дацэнта кафедры літаратуры Ганны Віктараўны Навасельцавай. У рубрыцы «Перакладзі ж мяне, паэт» Анастасія Шчаглова прапануе Вам аўтарскі пераклад верша «Сняжок» Барыса Пастарнака, а «Пераклады» прысвечаны каляднай батлейцы ў аўтарскім перастварэнні Яны Барысевіч.

«Каледж піша» нязменна падаецца ў кожным нумары нашага часопіса. Полацкі каледж імя П.М Машэрава  зноў дзеліцца новымі вершамі сваіх навучэнцаў. «Святкуем!» — 14 лютага споўнілася 130 гадоў з дня нараджэння Канстанцыі Буйло. У «Падзеях на ФГіМК» чытайце, як факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый адсвяткаваў Міжнародны дзень роднай мовы.

У анансаваных падзеях Вы зможаце даведацца, як у гэтым годзе будзе праводзіцца традыцыйная акцыя да Дня Канстытуцыі «Праз дыялог моў — да душы, да сэрца». Сярод новых рубрык у гэтым нумары «Жарты-жартачкі», дзе Анастасія Сіманковіч дзеліцца гумарэскай пра першую сесію (мажліва, нехта з першакурснікаў пазнае сябе). У «Зорнай эстафеце» прадстаўлены лепшыя працы літаратурнай секцыі аднайменнага конкурсу (поўная інфармацыя размешчана на сайце ўніверсітэта).

Рубрыка «Чытаем класіку на ФГіМК» адлюстроўвае творчае асэнсаванне студэнтамі твораў рускіх і замежных класікаў. Спроба перадаць уражанні, індывідуальныя меркаванні найлепш рабіць у жанры эсэ. У гэтым нумары можна прачытаць эсэ ад студэнтаў 203-й групы па «Ганне Карэнінай», «Беспасажніцы», «Вялікаму Гэтсбі» і «Шагрэневай скуры». Актуальная інфармацыя для абітурыентаў ФГіМК змешчана ў адпаведнай рубрыцы.

З намі можна звязацца ў Viber, Telegram, а таксама праз электронны адрас, які змешчаны на апошніх старонках кожнага нумару. Чытайце нас! Пішыце нам! Дзяліцеся нашымі публікацыямі! Дапамагайце чытачам адкрываць новыя імёны, а пісьменнікам знаходзіць удзячных чытачоў. Часопіс размешчаны на галоўнай старонцы сайта ВДУ імя П.М. Машэрава (Галоўная-Універсітэт-Факультэты-Факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый).

*З павагай,*
*галоўны рэдактар Селязень Кацярына,*
*студэнтка 41-й групы ФГіМК.*

*Писать я стала относительно недавно. Пишу о том, что для меня важно на данный момент. Главное, не упустить вдохновение, когда оно всё-таки решило заскочить в гости.*

*Сколько себя помню, всегда любила читать. В особенности, стихотворения. Всегда было интересно, почему писатель является художником, есть ли какой-то особый секрет в написании произведений и как себя ощущают поэты. Надеюсь, мне когда-нибудь удастся ответить на эти вопросы.*



## Даниэла Горина

**ФГиЯК, 1 курс, 101-я гр.**

### Любимая книга:

Джон Кехо
«Квантовый воин».

### Любимая цитата:

«Лучший способ совершенствоваться — окружать себя лучшими людьми. Они сделают вас лучшим человеком»
(Алан и Барбара Пиз).

### Кредо в литературном творчестве:

Писать искренне и о том, что для тебя важно (ты излагаешь свои мысли, эмоции, а кто-то находит в твоих текстах себя).

***

Я родилась в крещенские морозы.
Двина и Витьба — все покрыто льдом.
А почему в тот день мне дарят розы,
Узнала я, конечно же, потом.

Великий православный праздник
Придал для жизни много-много сил,
Своим волшебным, чистым, ясным светом
Мой день рожденья сразу озарил.

Открылся мне заснеженный любимый
Витебск.
Я восхищаюсь смелостью людей,
Которые ныряли в прорубь с криком,
А духом становились все сильней.

Я счастлива: мне выпало родиться
В январские святые дни.
Они мне часто-часто будут сниться,
И силы в жизни придадут они...

***

Безустанно мечтаю о звёздах.
Как добраться до них, подскажите.
В суете бытия и заботах
по кускам вы меня соберите.

И уж вплоть до последнего вздоха
Светило мерцает все ярче.
Провожу параллель я с собою.
Где меня поджидает удача?

Туз мечей разыгрался не в шутку.
Вольным ветром, сняв обличье, бы стать...
Удержать бы остатки рассудка
И бесцельной, безрадостной жизни

Такому, как я, избежать

***

А щеки наши украсит румянец,
Когда обычным зимним днем,
Пурга создаст снежинок танец —
Запахнет снова волшебством.

Пришла пора начать сначала
И жизнь, и новое письмо.
С желанием сделать все, как надо,
Предать огню ещё одно.

Оставь вне времени обиды,
А сожаленья — за спиной,
Верши в реалиях эскизы
Из мечт, обузданных тобой.

***

А в моей памяти
всплывает
Медляк на кухне в
зимний вечер.

И образ карих глаз
мелькает
Таких родных и
безупречных.

И в моём мире шторм
бушует
И много мыслей
непокорных.

Взор карих глаз меня
чарует
Так выразительно
холодных...

***

Пусть я неправильно
Мыслю, быть может,
Но быть оптимистом
Мне судьбою положено.

Да, сердце сейчас
Разбито на части,
Но верю во временность
Сего я несчастья.

Звезда упадет —
Загадаю желание
О глубочайшем
Себя я познании.

Читаю, как мантру,
Я эти строки.
Затянутся раны,
И вымрут пороки.

И миру откроюсь
Я искренне также:
Сниму-ка обличье
Я жертвы несчастий.

***

Как задорно сияет сейчас
Улыбка, явлённая в радостный миг:
Будто юный рассвет, внезапно смутясь,
Абие распадясь, горизонта достиг.

# ПАЭЗІЯ

*Я пачала пісаць вершы ў сёмым класе (хоць і раней былі спробы складаць рыфмаваныя радкі, нават пісаць тэксты песень). Да мяне зусім нечакана і невядома адкуль прыйшло натхненне. Літаральна за некалькі хвілін з'явіўся мой першы твор, напісаны па-беларуску. Гэта быў верш пра каханне. З таго часу і пачаўся мой творчы шлях. Тэматыка вершаў разнастайная, але, у цэлым, сацыяльна скіраваная. Мае вершы — спосаб адкрыцца сабе і свету, адказаць на пытанне, хто я ёсць. З кожным новым творам праз вобразы лірычных герояў, дэталі, тропы я знаёмлюся з сабой і дзялюся гэтым з іншымі.*



## Анастасія Шчаглова

ФГіМК, 3 курс, 31-я гр.

**Любімая кніга:**
«Сэрца на далоні» Івана Шамякіна.

**Любімая цытата:**
«Чалавек - гэта цэлы свет» (Кузьма Чорны).

**Крэда ў літаратурнай творчасці:**
«Пісаць. Пісаць многа. Пісаць ад сэрца і да сэрцаў. Творчасць — люстэрка жыцця. Кожная яго праява фіксуецца і адбіваецца ў вершах, казках, раманах, паэмах, байках... Яны павінны быць кранальнымі. Да глыбіні душы. Менавіта тады творца і яго мастацтва будуць жыць».

***

*апошнім акордам разбітай свабодзе*
*пакінулі воцат на кончык нажа.*
*за круглым сталом не сядзіць ніхто болей,*
*а рамкі пастаўлены ўпоперак нам.*
*заплюшчаны вочы халоднай рукою —*
*ну дайце мінуту спакойна пажыць!*
*не бачачы, чуць, як утопіі гора*
*маўкліва і горда бяспынна дрыжыць.*
*за процьмай бяды дачакаецца шчасце,*
*каб промнем агню разагрэла душу.*
*нам зоры спяваюць, бо вера ў праўдзе,*
*нам месяц падкажа пакутаў мяжу.*

***

я что-то такое аморфное,
я что-то за гранью живых.
с конца до начала мерзотными,
отпетыми трупной души
печальными струнами возгласы
без помощи бьёт по лицу.
он больше не кажется совестью —
он больше похожий на суд.
об реки воды посиневшие
я гладью рассыпала ртуть.
конец и начало тут смежные,
миж ими стоит долгий путь.
не быть беззаботным романтиком,
когда погибает мечта.
реальность окутает мантией,
по берегу мчась не спеша.
захочется вынырнуть, справиться,
спастись от хмельной гнилоты.
но быть нам аморфными нравится
и нравится рушить мечты.





***

я сябе адчуваю няправільна
ў рызорах разгубленых правілаў
мы сюжэт завяршаем анафарай
перабралі на звязцы ключы.
нам с тобой контролировать нечего
у истоков словесного месива
белым флагом все окна завесили
і ў танцы згарэлі мячы.
па абрадах аматараў досведу
мы не дбаем аб выніках поспеху
раны сэрца матаюцца ў космасе
пад калодай бяжыць далячынь.
после долгой разлуки не хочется
мне опять покидать одиночество
и в конце всех концов наши почести
павядуць на апошні спачын.

*Асновай для вершаў можа стаць што заўгодна: пейзаж за акном, бытавыя сітуацыі, асобасныя перажыванні, музычны, літаратурны ці мастацкі твор. А вось сэнсам верш напаўняецца пазней, калі галоўны герой ужо выбраны, калі месца сустрэчы змяніць нельга. Тады кот ператвараецца ў здрадніка, а сабака — у даверлівага чалавека.*



## Віялета Кірылава

ФГіМК, 4курс, 41-я гр.

**Любімая кніга:**
Віктар Гюго
«Апошні дзень прыгаворанага на смерць».

**Любімая цытата:**
«Прослыть умным нетрудно — надо только молчать и ждать, пока другие выговорятся. Когда они все утомятся и уже перестанут соображать, что к чему, надо сказать два-три слова. И тебя сочтут мудрецом» (Ганс Эрых Носсак).

***

*Ноч. Вуліца. Фанар. Аптэка.*
*Вечар. Дом. Комін. Суседка.*
*Дзень. Лес. Сонца. Суніцы.*
*Раніца. Лямпа. Мятая спадніца.*

*Ноч. Пакоі. Лямпа. Сон.*
*Вечар. Баль. Галасы ва ўнісон.*
*Дзень. Арэлі. Задні двор.*
*Раніца. Возера. Рыбалка. Сом.*

*Ноч. Дыскатэка. Музыка. Гоман.*
*Вечар. Гатаванне. Сям'я. Гора.*
*Дзень. Весткі. Паштоўка. Сум.*
*Раніца. Пачуцці. Нейкі гул.*

*Ноч. Згода. Іншых варыянтаў няма!*
*Вечар. Прапановы. Сумнеў.*
*Дзень. Роздум. Пытанне.*
*Раніца. Хмара. Гатаванне.*

*Ноч. Дабрата. Адчуванне.*
*Вечар. Дапамога. Спачуванне.*
*Дзень. Рашучасць. Сустрэча.*
*Раніца. Чалавечнасць.*



***

*Было гэта дзесьці ўвечары,*
*Калі сапраўднаму студэнту рабіць нечага.*
*Глядзела я ў вакно задуменна,*
*Раптам убачыла падобную на каралеву*
*Варону, што на дрэве сядзела,*
*А секунду таму ў паветры ляцела.*

*Прыгожая, буйная, упартая была —*
*Гэта адразу ж зразумела я.*
*Сваю здабычу не выпушчала з дзюбы,*
*Крэпка сціснуўшы вострыя зубы.*
*Маленькая мышка дарэмна білася:*
*Страціла сілы — у адчай скацілася.*

*А руды кот, што раней на ганку ляжаў,*
*Зараз па галінцы хутка бяжаў.*
*Абедзвюх сцапаць хацеў з налёту,*
*Бо тоўстаму лужу піць больш не ахвота.*
*Варона за ежу па-царску крыламі біла,*
*Амаль што ўсю мышку ў сябе заглаціла.*

*Кот на нервах на зямлю спрыгнуў,*
*Дзе ўжо чакаў яго сябар не спрытны.*
*Сабака з аблезлай скурай, вухам падраным,*
*Храмы на пярэднюю лапу, але сэрцам адданы.*

*Учорай быў малады, дзяўчына яго ласкала,*
*Сёння ў зубах трымаў ён каўбасы кавалак.*
*Заўтра яго пахаваюць на заднім двары,*
*Так бывае, калі твае сябры — каты.*



Анастасія Сіманковіч, ФГіМК, 31-я гр.

## Першая сесія

*(Гумарэска)*

Першакурснік Ілля загадзя пачаў рыхтавацца да сесіі. Бо гэта ж так важна, так адказна. Такая падзея ўпершыню адбудзецца ў яго жыцці. Пачалося ўсё з прагляду ўсялякіх сайтаў у інтэрнэце, што такое сесія, і як яе здаваць, парады першакурснікам і сталым студэнтам. Начытаўшыся ўсялякіх жахаў, ён вырашыў: без народных павер'яў не абыйсціся. Таму знайшоў найлепшы сайт з парадамі для паспяховай здачы экзаменаў.

Ілля вырашыў паспрабаваць усё. Спачатку ён намаляваў у залікоўцы домік, з коміна якога ідзе дым, бо чым даўжэйшы дым, тым больш паспяхова будзе здадзена сесія, таму ў Іллі ён расцягнуўся на дзве старонкі і выйшаў аж за межы залікоўкі.

У ноч перад экзаменам Ілля прызываў «халяву», за некалькі хвілін да поўначы ён высунуў галаву ў акно, пачакаўшы, тры разы крыкнуў: «Халява, прыйдзі!» Гэтага было недастаткова для канчатковай упэўненасці, таму ён вырашыў правесці яшчэ адзін рытуал з залікоўкай.

Ноччу ён прыйшоў на кухню і дастаў соль, але ўсё як заўсёды пайшло не так: соль рассыпалася, гэта суправаджалася шумам, але галоўнае было пасыпаць ёй залікоўку. Гэта ён і зрабіў. Ад шуму на кухні, прачнуліся бацькі.

— Ілюша, што здарылася?— спытала маці.

— Нічога страшнага, ідзіце далей спаць, не перашкаджайце рыхтавацца да экзамену! — адказаў Ілля.

— Неяк дзіўна ты рыхтуешся, — сказаў сыну бацька, — мы ў свой час падручнік пад падушку клалі.

— Дзякуй, бацька, і гэтай парадай скарыстаюся.

Ілля пайшоў у свой пакой далей «рыхтавацца» да экзамену. Кніжка і канспект пад падушкай, можна спаць.

Раніцай Ілля ўстаў з левай нагі, апрануў шкарпэткі з левай нагі, пераходзіў парогі з левай нагі, усё рабіў з левай нагі для поспеху на экзамене. Сабраўся, паклаў пятак пад пятку і рушыў ва ўніверсітэт. Зайшоў ва аўдыторыю і ўзяў білет левай рукой. Пытанні ў білеце былі зусім незнаёмыя і невядомыя. Ілля зразумеў, што нічога не ведае. Наступіў час адказу. Выкладчык пачынае задаваць пытанні, Ілля не адказвае. Выкладчык пытаецца:

— Ну што ж вы мне не адказваеце, як вы рыхтаваліся да экзамену?
— Як і ўсе студэнты, — адказаў Ілля.
— Гэта як? — зноў запытаўся выкладчык.
— Я крычаў ноччу «Халява прыйдзі», падручнік пад падушку клаў, усё рабіў з левай нагі, палажыў пятак пад пятку.
— А вы вучылі што-небудзь? Ці праглядалі білеты да экзамену?
— Не, зусім не, толькі выканаў парады з інтэрнету.
— Там выпадкова нічога не было сказана пра тое, што трэба штосьці вучыць?
— Такой інфармацыі я не знайшоў.
— Вось вам найлепшая парада: вывучыце матэрыял і прыходзьце. Да наступнай сустрэчы!
Тады Ілля зразумеў, што акрамя ўсіх непатрэбных рытуалаў трэба яшчэ і ведаць матэрыял. Таму ў наступны раз першакурснік рыхтаваўся сумленна і выдатна здаў экзамены.





Гапоненко Светлана
ГУО «Бабиничская средняя школа Витебского района имени Героя Советского Союза Е.В. Василевского», 9 класс

## НАМ ДАН ШАНС

*Где сияют эти звезды, что мелькают над головой людей,*
*Где толпами миры кружатся, создавая млечный путь.*
*Есть ли там такие же люди, которых много на Земле,*
*Или там пришельцы бродят, не нарушая наш покой?*

*Ведь в неизвестном нам пространстве и другие планеты есть.*
*Но разглядеть и насладиться красотой этих небесных тел*
*Мы, к сожалению, не сможем никогда,*
*Или сможем?*

Я никогда не забуду три вещи в своей жизни: первую двойку по химии, которая поставила точку в моей карьере врача, первое слово моего попугая спустя 5 лет и глаза мамы, когда я вышла из ракеты, на которой улетела одна на другую планету. Но все по очереди.

Во вторник я, как всегда, не выспалась. Как можно выспаться, когда тебе 15, у тебя вот-вот начнутся экзамены, а ты совсем к ним не готова, а тут еще и Миша со своими шуточками? Вот и я не знаю.

Так вот, вторник. Я пришла в школу, нет, прибежала в школу за минуту до звонка. Первый урок химии, мой любимый предмет, ведь я всегда мечтала стать врачом. Понимая, что Михаил Геннадьевич уже вошел в класс, я опустила взгляд и постучалась в дверь. День начат плохо.

Тихонько достала книгу с тетрадью, открыла домашнее задание, а его там нет. Целый лист из моей тетради был безжалостно вырван.

— Я убью этого Мишку, — прошептала я со злостью.

— Что? Кого? Меня? — вскрикнул Михаил Геннадьевич, который только что подошел к моей парте.

— Ой, нет, вы не так меня поняли. Это Мишка, брат мой, листок из тетради вырвал с домашкой. Я про него говорила, а не про вас, — в полной растерянности затарахтела я.

— Ага, еще и задания нет. Значит, за работу 2, и то, это я вам их еще дарю, так и 0 можно поставить за отсутствие домашнего. И сейчас же к директору. За 24 года работы в школе мне еще никто не угрожал, — со всей строгостью сказал учитель.

Так я оказалась в кабинете директора. Двойка в дневнике, родители в школе, а я в полной уверенности, что больше никогда не буду учить эту химию и врачом мне не быть.

Мое настроение было испорчено на весь день, чего нельзя сказать о моих одноклассниках, которые собирались пойти завтра на торжественный запуск 100-ой модифицированной ракеты «Путь». Уже больше года самые лучшие представители разных сфер отправляются в космос, чтобы создать на какой-то там планете какие-то там условия. Наша планета с каждым годом умирает, и жить на ней становится опасно, так говорят ученые. Меня это никогда не интересовало, не люблю я все эти космические штучки. Если я чего-то не видела, как оно мне может нравиться? А все эти картинки, что нам показывают, я и сама могу в Photoshop сделать. Поэтому радости своих друзей я не разделяла.

После уроков я пошла домой. В моих планах были ужин, компьютер, сон и самое главное — никакой химии. Все так и должно было быть. За ужином со мной еще раз провели беседу, Мишке, как всегда, ничего не сказали. Мои родители — люди строгие, но когда дело доходит до наказания, то ничего лучше, чем выгулять Миндальку, так зовут моего попугая, они не придумывают. Поэтому мне пришлось идти на улицу. Да, да, я выгуливаю попугая, ничего удивительного не вижу. Кто-то в космос летает и сажает там картошку, а я выгуливаю попугая.

Когда мне приходится гулять с попугаем, то мы всегда ходим одной и той же дорожкой, где никого не бывает — так и мне, и Миндальке спокойнее, ведь мы оба до жути боимся собак. Но день был бы не окончательно ужасным, если бы наша прогулка прошла без проблем. На середине нашего пути мы встретили двух девочек с огромными собаками, больше самих этих девочек. Еще за 30 метров я свернула с дорожки в какие-то кусты, лишь бы не встретится с этими собаками: кто знает, что у них в голове.

Наверное, это было не лучшее решение, ведь спустя 10 минут мы вышли в совершенно неизвестном месте. Может, мы и смогли бы найти дорогу назад, будь хоть чуточку посветлее, но осенью в 8 часов уже очень темно. Я поняла, что не знаю, где мы, и решила включить навигатор. Пока я что-то пыталась найти, мне послышались странные звуки за моей спиной. Ровно через мгновение я услышала крик в свое ухо: «Бежим!». И я побежала. Такого страха я не испытывала никогда, ведь я была уверена, что за мной гонятся те самые собаки. Я бежала до тех пор, пока не увидела силуэт какой-то лестницы. В тот момент мне было все равно, куда я попаду, лишь бы не в зубы собакам. Забежав по лестнице, дверь автоматически закрылась. Я выдохнула. Здесь я в безопасности: собак нет.

Немного времени мне понадобилось, чтобы прийти в себя и перевести дыхание. В моей голове сразу возник вопрос, а кто кричал, ведь с собаками были девочки, а голос какого-то дедушки?

— Фух, убежали, к такому повороту событий я был не готов, — раздался голос за спиной.

— Ааааа, — закричала я.

— Ааааа, чего орешь? — так же в ответ закричал мне попугай.

— Миндаленька? Ты что, говорящий попугай? — с чувством искреннего непонимания спросила я.

— Не заговоришь тут с вами. Столько лет молчал, лишь бы не трогали, но жизнь, знаешь ли, дороже, — ответил он мне.

Мы несколько минут смотрели друг на друга и не знали, что делать дальше. Но наше молчание перебил странный звук, похожий на тот, что издает микроволновка. Резко включился свет — все вокруг замигало и затрещало. Только сейчас я поняла, что от страха забежала непонятно куда. Где вообще была моя голова, когда я запрыгнула на ступеньки и вбежала в неизвестное мне место? Яркий свет сначала не давал мне разглядеть место. Как только я привыкла к освещению, то сразу увидела множество панелей со светящимися кнопками, какие-то рычаги и экраны.

— Вот это да! Ха, ракета, точь-в-точь как в телевизоре вчера показывали, — усмехнулся Миндаль.

— Мы что, забежали в ракету? Вот нам попадет. Надо быстрее убегать отсюда, — произнесла я.

Я рванула к двери, но ручки там не было. Попыталась толкнуть ее, как-то открыть. У меня ничего не получилось. Справа от двери я увидела рычаг и сразу же дернула его. Свет резко выключился, послышалось три долгих гудка, и приятный женский голос сказал: «Счастливого пути! Мы изменим наш мир к лучшему!».

Мой испуг от понимания происходящего невозможно было передать. Я начала бегать по этой маленькой комнате и стучать по всем стенам. Миндалька нажимал все кнопки на панелях без разбора и кричал: «Я так молод. Я так красив. Мне нельзя умирать!».

Наша истерика продолжалась несколько минут.

Устав от бега и крика, я уселась на пол и горько заплакала.

— Что же нам делать? Мы же не может взять и полететь в космос. А что скажет мама? — снова зарыдала я.

— Да, к такому повороту событий я не был готов, — с очень важным видом сказал попугай.

— Земля, вызывает Путь. Земля, вызывает Путь, — послышалось с экрана.

На самом большом из мониторов я увидела пожилого мужчину, который был явно чем-то недоволен, и, мне кажется, я знаю чем. Я подбежала к микрофону возле экрана и начала кричать что есть мочи.

— Мы здесь, мы здесь. Заберите нас отсюда. Мы просто бежали, а тут эти ступеньки. Мы наверх. Дверь закрылась. Мы стучали. Она ничего.

— Успокойся. Ты на борту ракеты «Путь» и летишь сейчас на планету Шанс. Непонятно как, но ты смогла обойти всю нашу систему безопасности. Остановить ракету никто не сможет, тебе остается соблюдать все мои указания и надеяться на удачный исход. Как тебя зовут? Ты одна на борту? — спросил меня мужчина с экрана.

— Меня зовут Света. Со мной попугай Миндаль, это из-за него я здесь, — ответила я.

Федор Петрович, так зовут мужчину с экрана, мне объяснил, что надо делать и что меня ждет. К моему везению, если его так можно было назвать, мы летели на планету, которая приспосабливалась для жизни людей, поэтому там, как минимум, был кислород. Как мы летели, сколько это длилось, я не знаю. Все мои мысли были лишь о том, как со мной такое могло произойти и что скажет мама, когда узнает об этом.

В моих представлениях мы прилетим на непонятную планету с кучей кратеров, пылью и пустотой.

# ЗОРНАЯ ЭСТАФЕТА

Каково было мое удивление, когда открылся люк, и передо мной находился невероятной красоты город. Цветущие сады, благоухающие цветы, прекрасно поющие птицы, высокие дома, широкие чистые улицы. Яркие краски сразу бросались в глаза. Казалось, здесь вечное лето. Но стоило повернуть голову в другую сторону, и можно было увидеть снежные горки, падающие снежинки, морозные узоры на окнах. В моей голове не укладывалось все это. Как же такое может быть возможно?

Через одну минуту возле меня уже стояли два человека, лица которых я помню из передачи о космосе, которую смотрел мой папа. Это были агрономы Денис и Лиза Куприны, прилетевшие сюда около года назад. Я была уже готова услышать упреки в мою сторону, была готова к самым ужасным наказаниям, но этого не случилось. Меня с Миндалькой встретили очень радушно, проводили в главный космический офис.

По дороге я наблюдала за происходящим из окна машины. Вы когда-нибудь видели дерево, на котором растут и яблоки, и сливы? Может, вам приходилось встречать вечноцветущие розы? А что бы вы сказали, увидев, как только что посаженный куст томатов через минуту дает плоды? Поразили бы ли вас ромашки, цветущие на снегу? Это лишь малая часть того, что я смогла увидеть за 10 минут нашего пути.

— Как это возможно? Нашей планете столько лет, но у нас нет такого. Эту же планету нашли пару лет назад, а столько всего сделали. — спросила я у Лизы.

— Земля — прекрасная планета, которая дарила нам жизнь и отдавала все свои силы более 4 миллиардов лет. Но мы не ценили это, не оберегали нашу планету, а лишь брали и брали. У всех заканчиваются силы, все устают, вот и наша Земля устала. Мы не знаем, сколько осталось времени у нашей планеты. Теперь, имея опыт, мы совсем по-другому относимся к данным нам ресурсам. Все, что ты увидела и будешь видеть на этой планете, — это не год работы, это сотни, тысячи лет опыта, который приобрело человечество. Сейчас наша задача — воспользоваться данным нам шансом и создать мир с нуля, оберегать и сохранять все то, что мы имеем, — ответила мне Лиза.

— Теперь я понимаю, почему эту планету назвали Шанс, — с восторгом сказала я.

— Да, к такому повороту событий я не был готов, — в восторге закричал Миндаль. — Вы посмотрите на это.

В одном из кабинетов космического офиса сидели работники, а вместе с ними попугаи, которые внимательно смотрели в экраны, о чем-то рассуждали, были заняты делом.

— О, это наши помощники, — сказал Денис. — Попугаи очень умные и эрудированные птицы. С их помощью мы развили многие отрасли животноводства и растениеводства. Хотя, кто бы мог подумать. Вот ты знала, что...

Дениса внезапно перебила Лиза и сказала, что надо спешить, ведь нам пора домой. Мы очень быстрым шагом направились за Лизой. На открытой площадке уже стояла маленькая ракета, были приготовлены костюмы для меня и Миндальки. Мне совсем не хотелось улетать отсюда, ведь я еще ничего не успела увидеть, рассмотреть, попробовать, но и оставаться мне было нельзя. С некоторой грустью и печалью, но одновременно и с чувством радости я села в ракету.

Весь полет я думала лишь о том, как прекрасен космос, такой неизвестный, далекий, но уже такой близкий моему сердцу. Вспоминая тот ужасный вторник, я все больше и больше радовалась двойке по химии, которая поставила точку в моей карьере врача и помогла понять, что именно космос и есть мое призвание.

Я не знала, какой сегодня день, сколько времени, мне казалось прошел час, может, два. Когда мы приземлились, тот самый приятный женский голос произнес: «Вторник, 8:00». Прошла целая неделя, прекрасная неделя, незабываемая неделя моей жизни. Вся моя жизнь повернулась с ног на голову. Все, что я знала, что представляла о мире, изменилось в один момент.

Мы выходили из ракеты с четким представлением о том, что с нами будет дальше, как сложится наша жизнь. Забегала в эту ракету маленькая девочка, которая и думать не хотела о нашем будущем, о возможностях, которые дает нам космос, сейчас же по ступенькам спускается человек, который уверен, что посвятит свою жизнь космосу. А Миндаль уже мысленно примерял на себя костюм космонавта и как всегда повторял: «К такому повороту событий я не был готов».

Я никогда не забуду три вещи в своей жизни: первую двойку по химии, которая поставила точку в моей карьере врача, первое слово моего попугая спустя 5 лет и глаза мамы, когда я вышла из ракеты, на которой улетела одна на другую планету.

## Виталия Белоголова

ГУО «Средняя школа №1 им. Героя Советского Союза
П.А. Акуционка г.п. Шумилино», 9 «В» класс

### *Невообразимая Вселенная*

*Стою на холме высоком,
Гляжу на  ночное небо
И знаю: мы не одиноки.
Я точно уверена в этом.*

*Есть в мире открытий много
И глазу пейзажей приятных.
Мы видели даже космос!
Величественный… Необъятный…*

*Есть сотни чудес планеты:
Поля, океаны и горы,
Но сколько таят секретов
Галактики нашей просторы?*

*Слияния звезд нейтронных —
Явления так прекрасны!
Не сотни их, не миллионы.
Считай — да не хватит пальцев!*

*Стою на холме высоком,
Взирая в пространство ночи.
Я верю: мы не одиноки.
Я в этом уверена точно!*

Мы знаем всего-то малость,
А космос велик, бесконечен!

Достаточно нам осталось
Исследовать: Космос вечен...

На Млечном Пути нашей
Планете Земля нетесно,
Но все мы, живые люди,
Себе не находим места.

Среди сияний, квазаров,
Среди галактик бессмертных,
Мне кажется, есть и кто-то
Глядящий на нас сверху.

Стою на холме высоком,
Гляжу на ночное небо
И вижу, как нас, одиноких,
Приветствуют звезды светом.

Стою, и молчу, и знаю,
Что скоро ночное небо
Нам скажет: «Не одиноки!»
Я точно уверена в этом!

# АД КАРЭСПАДЭНТА

Анастасія Сіманковіч, ФГіМК, 31-я гр.

## Жыццё — гэта не толькі прафесія выкладчыка

*Немагчыма ўявіць наш універсітэт без студэнтаў. Аднак не трэба забывацца, што ўніверсітэт — гэта не толькі навучэнцы, але яшчэ шматлікі прафесарска-выкладчыцкі калектыў, які выконвае ключавую ролю ў складанай адукацыйнай сістэме. Выкладчыкі — гэта людзі, якія заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу, падказаць, растлумачыць, падтрымаць. Часцей за ўсё мы ведаем нашых выкладчыкаў толькі ў межах універсітэцкага жыцця. Нам, студэнтам, здаецца, што яны займаюцца толькі навукай і бясконца чытаюць лекцыі.*
*Ці задумваліся вы калі-небудзь, што робяць выкладчыкі ў вольны час? Ці ёсць у іх якія-небудзь незвычайныя заняткі? Альбо толькі навука і праца? Для таго, каб адказаць на гэтыя пытанні, варта толькі звярнуцца да саміх выкладчыкаў. Яны з задавальненнем падзеляцца сваімі захапленнямі і развеяць міф пра тое, што выкладчыцкае жыццё абмежавана педагагічнай дзейнасцю. Спецыяльна для чытачоў нашага часопіса я паразмаўляла з некаторымі выкладчыкамі ФГіМКа і гатова расказаць пра цікавыя моманты іх жыцця. Вось, што мне давялося даведацца...*



*Галіна Канстанцінаўна Семянькова, дацэнт кафедры мовазнаўства, кандыдат філалагічных навук.*

**— Маё захапленне — падарожжы па нашай краіне. Кожнае лета я абавязкова адкрываю для сябе якія-небудзь гарады, вёскі, у якіх да гэтага ніколі не была. Раблю там фотаздымкі, на іх аснове ствараю фотаальбом, а зімой праглядаю яго, каб зноў акунуцца ў летнія эмоцыі і пачуцці. Мару пра наступнае лета. Гэта дапамагае перажыць халодную зіму. Люблю сустракаць сонца. Летам яно прачынаецца ў 4 гадзіны. Люблю глядзець і фатаграфаваць закаты.**
**Абавязкова купаюся ў возеры, на бераг якога прыязджаю (незалежна ад надвор'я). Гэта такая традыцыя.**
**Словам, люблю падарожжы, жыццё, стараюся кожны дзень пражыць з карысцю для сябе.**

# АД КАРЭСПАДЭНТА

*Вольга Юр'еўна Радзюль, старшы выкладчык кафедры мовазнаўства.*



*праца Вольгі Юр'еўны*

**— Люблю ляпіць з палімернай гліны. Лепкай я пачала займацца даўно, гадоў 10 назад. Ляпілі разам з дзіцём з салёнага цеста разнастайныя вырабы, самі размалёўвалі. З узнікненнем палімернай гліны працэс лепкі стаў больш простым, але ад гэтага не менш цікавым. Лепка з палімернай гліны вельмі падобная да лепкі з пластыліну, але ёсць свае тонкасці і нюансы. Лепка мяне супакойвае, паколькі пры пагружэнні ў творчы працэс я абстрагуюся ад надзённых праблем і мітусні.**

**У асноўным я ўпрыгожваю палімернай глінай кубачкі, якія потым з радасцю дару сваякам, сябрам, калегам. Я вельмі люблю кветкі, і менавіта таму ў маёй калекцыі пераважаюць кубкі з разнастайнымі кветкамі з палімернай гліны.**

**У кожны кубак я ўкладваю частачку сваёй душы і, спадзяюся, гэта адчуваюць тыя, хто атрымлівае ад мяне такі падарунак.**



*Елізавета Пятроўна Шрамук, выкладчык кафедры гісторыі і культурнай спадчыны.*

**— Я маю разрад кандыдата ў майстры спорту па палявой стральбе. Няхай вас гэта не здзіўляе, бо, акрамя гэтага, я ўсё жыццё марыла авалодаць халоднай зброяй. Яшчэ падчас вучобы ў школе (СШ №6 г. Віцебска) у нас з'явілася секцыя па стральбе. Мяне гэта дужа зацікавіла, і я пачала наведваць трэніроўкі. Спачатку мы вучыліся страляць з вінтоўкі, а пасля пачалі ездзіць на спаборніцтвы і займаць прызавыя месцы.**

**Доўжылася маё захапленне 8 гадоў.**

**Нягледзячы на ўсе мае дасягненні ў гэтым відзе спорту, цяпер я не займаюся палявой стральбой. На такі занятак патрабуецца шмат часу і энергіі. Дзякуючы майму былому хобі, у мяне выдатна развітыя дысцыплінаванасць, уседлівасць і перыферыйны зрок, які дапамагае ў выкладчыцкай дзейнасці сачыць за тым, каб студэнты не спісвалі.**

**Зараз у вольны час я аддаю перавагу маляванню і стварэнню кандытарскіх вырабаў.**

# АД КАРЭСПАДЭНТА

— У мяне шмат захапленняў, я малюю, вяжу кручком, фатаграфую пейзажы, пішу кароценькія гумарыстычныя расказы. Але галоўнае і асноўнае хобі, хутчэй лад жыцця — гэта «Што? Дзе? Калі?»
Я гуляю ў «Што? Дзе? Калі?» і ўсім настойліва рэкамедую. Яшчэ ў студэнцкія часы я трапіла на адну з першых гульняў па знаёмстве, сяброўка прапанавала паўдзельнічаць у складзе адной з каманд. Мая першая каманда складалася з мяне і пяці хлопцаў. Пасля гэтага мяне запрасілі ў асноўны склад, так мы гулялі 12 гадоў. Паколькі назва «Што? Дзе? Калі?» запатэнтавана маскоўскай кампаніяй, мы гуляем у КВРМ («Кароткую віктарыну з раздаткамі па мінутах»).
У апошні час вельмі змяніўся фармат гульняў. Спачатку медалі выдавалі толькі на самых сур'ёзных турнірах, цяпер узнагароду можна атрымаць на любым мерапрыемстве. Я двойчы чэмпіён Рэспублікі Беларусь па «Брэйн-рынгу», неаднаразовы прызёр у разнастайных іншых мерапрыемствах, такіх як Адкрыты чэмпіянат Віцебска, «Свая гульня», «Мазгавы штурм». Спаборніцтвы звычайна ладзяцца ў Гарадскім цэнтры культуры па суботах. У Віцебску ёсць вышэйшая ліга, для больш вопытных удзельнікаў, і першая ліга, для навічкоў. Усю інфармацыю пра гульні можна знайсці ў групе Укантакце «Віцебскі інтэлектуальны клуб». Турніры праводзяцца не толькі ў нашым горадзе. Віцебскія знаўцы ездзяць на гульні па ўсёй рэспубліцы, у Расію і ў краіны бліжняга замежжа. Акрамя таго, распаўсюджанне атрымліваюць паб-квізы, якія праводзяцца ў барах, пабах, кафэ, дзе падчас харчавання можна прыняць удзел у гульні, такім чынам, сумясціць прыемнае з карысным.
Гульня ў «Што? Дзе? Калі?» дапамагае завесці карысныя знаёмствы, якія ў будучым могуць дапамагаць вам ў жыцці. Студэнтам вельмі раю такі занятак, калі вы жадаеце атрымліваць сапраўднае задавальненне ад супрацоўніцтва, «інтэлектуальны кайф» у чыстым выглядзе, азарэнне. Таму што, калі вы адказываецце на пытанне, вы атрымліваеце дозу дафаміна. Збірайце каманду з 6 чалавек і прыходзьце, нават, калі ў вас няма сваёй каманды, прыходзьце і вам яе знойдуць, як калісьці было са мной.




*Яўгенія Алегаўна Далімаева, старшы выкладчык кафедры філасофіі і сацыяльных навук.*



*Медалі*

**— У вольны час я атрымліваю асалоду ад напісання фэнтэзі. Мяне натхняе багатая на карыфеяў прыгожага пісьменства, апетая імі маляўнічая, азёрна-лясная Ушаччына. Гэта мая малая радзіма. Такая зямляцкая пераемнасць шмат да чаго абавязвае. А сакавітая вушацкая гаворка звыклая мне змалку. Да майго выхавання прычынілася бабуля, якая ведала шмат песень, казак, прыказак, прымавак, вельмі любіла апавядаць, і, каб пацешыць маленькую ўнучку, прыдумвала розныя гісторыі. Яна прывіла цікавасць да ўсяго гэтага, таму я з дзяцінства расла вялікай фантазёркай. Мая творчая дзейнасць пачалася з лірычных вершаў, якія з цягам часу плаўна пераўвасобіліся ў прозу. Пішу кожны дзень пакрысе. Бачу свой тэкст — і нібыта нехта падказвае, што і як будзе далей. Потым рукапіс ляжыць у шуфлядзе, праз нейкі час**




*Ганна Віктараўна Навасельцава, дацэнт кафедры літаратуры, кандыдат філалагічных навук.*




**вяртаюся да яго, перачытваю. Новыя творы нікому не паказваю, а калі яны мяне задавальняюць, прапаную часопісам.**

**Сваю прозу адрасую ўсім аматарам фэнтэзі, бо гэта жанр без узросту, аднак пераважна ўсё ж моладзі. Стаўлю найперш адукацыйную мэту: зацікавіць міфалогіяй і фальклорам, якія выкладаю, сваіх студэнтаў. Апошнія з’яўляюцца даволі патрабавальнымі чытачамі... Пакуль буду працягваць працу ў міфалагічным, фантастычным рэчышчы, бо гэта мая, як зараз кажуць, творчая ніша.**

# АД КАРЭСПАДЭНТА

**— Ужо каля 20 гадоў я займаюся фітнесам, яшчэ раней хадзіла на танцы. Мае трэніроўкі праходзяць у фізкультурна-аздараўленчым комплексе, які знаходзіцца каля нашага ўніверсітэцкага стадыёна. У мяне ёсць пастаянны трэнер, з якім я займаюся, калі на звыклым месцы няма трэніровак, напрыклад у летні перыяд, я іду туды, дзе яны ёсць: клуб «Нон-стоп» альбо цэнтр «Віцебскэнэрга». Ніколі не прапускаю трэніроўкі, каб не выпадаць з сістэмы, абавязкова 3-4 разы на тыдзень.**
**Любая аэробная нагрузка спальвае адмоўныя эмоцыі. Чым складанеей час у вашым жыцці, тым актыўней трэба трэніравацца, каб выплюхнуць усё адмоўнае на ўзроўні фізіялогіі, а не пры дапамозе эмоцый, слёз, стрэсу і г. д.**
**Фітнес вельмі рознабаковы на віды: пілатэс, ёга, аэробіка. Кожнаму трэба знайсці сваё. Камусьці падабаецца бег, камусьці — займацца ў трэнажорнай зале, камусьці — хадзіць на танцы. Мая дачка нейкі час хадзіла са мной на фітнес, але потым яна вырашыла, што ёй больш падабаецца ў трэнажорнай зале. Фізічнай нагрузкай трэба займацца, каб адысці ад сідзячага ладу жыцця, ад цыфравізацыі, сацыяльных сетак. На занятках вы атрымаеце шмат жывой камунікацыі і новых эмоцый. Падбярыце сабе хобі па фізічным дадзеным, па тэмпераменце, па сваіх жаданнях. Так калісьці я выбрала аэробіку за яе хуткі тэмп і не шкадую, а толькі раю ўсім.**



Людміла Віктараўна Кажэкіна, старшы выкладчык кафедры сусветных моў.

*Я спадзяюся, што мне ўдалося расказаць вам пра захапленні нашых выкладчыкаў і вы змаглі даведацца, што яны не толькі чытаюць лекцыі і займаюцца навукай. Жыццё выкладчыкаў такое ж насычанае, цікавае і незвычайнае, як і студэнцкае.*
*Дзякую ўсім выкладчыкам за прадастаўленую інфармацыю і фотаздымкі!*

Фотаздымкі з асабістых архіваў выкладчыкаў.



*«Мэта маёй творчасці — адукацыйная, пішу найперш для сваіх студэнтаў, якіх хачу зацікавіць міфалогіяй і фальклорам. Галоўнымі героямі выступаюць вядомыя чарадзейныя персанажы, міфалагічныя істоты, якія праходзяць дзівосныя выпрабаванні, спазнаюць сябе і вучацца разумець іншых. Чытачу трэба задумацца, чаму ліска-чарадзейка шкодзіць дзеду з бабай, што ставіць вышэй за дабрабыт незвычайны каток, на якія ўчынкі здатная сучасная Папялушка. Казачнае фэнтэзі мае даўнюю традыцыю ў беларускай літаратуры. А ў сённяшнім свеце казка патрэбная не толькі дзецям, але і дарослым».*

## Ганна Віктараўна Навасельцава

**Дацэнт кафедры літаратуры**

**Друкавалася ў абласных перыядычных выданнях, часопісах «Маладосць», «Полымя», штотыднёвіку «ЛіМ», калектыўных зборніках.**

**Аўтар кніг міфалагічных апавяданняў «І чарам сніцца чалавек...» (2016), сучасных казачных гісторый «Калі цябе спактае казка...» (2018).**

## СНЕЖНАЯ, СНЕГАВАЯ...

*(Ня)казка*

Снежная, сняжыністая, снегавая... Якая ж яна, белая ўладарка снягоў? Проста чароўная снежка, скажуць тыя, хто носіць цеплыню ў сэрцах. Цешыцца срэбным інеем... Не, злая і марозлівая, зайздросна прамовяць тыя, хто пазбыўся сваёй цеплыні. Кпіць з ільдзістай просіні, не бачыць болей зімовай прыгажосці. Ды не, вытанчаная, зграбная, абыякавая, запэўняць тыя, у каго дзьме сцюдзёны холад... Хто ніколі не ведаў цеплыні, той не чуе снягоў і зімы. Льдзістая. Снежная-снежная... А ці прыгожая снегавая баба, злепленая няўмелай рукою маленькага хлопчыка?

Першы снег быў чыстым, бялюткім і такім радасным. Густой мяккай покрыўкай лёгка спавіў зямлю і маленькі цёплы свет. Мабыць, ад таго хлопчык з яснай сонечнай усмешкай спяшаўся па снезе... У яго быў найпершы клопат: зляпіць снегавую бабу, а таму малеча доўга і старанна катаў пульхлыя камякі. Першы, другі, трэці. На першы зацягнуць другі, на другі ўзваліць трэці... Хлопчык адбегся, каб зірнуць сур'ёзным вокам на сваю працу. Зірнуў. Засумаваў. Пакрыўдзіўся. Баба атрымалася касой у постаці, гарбатай і як быццам злоснай.

— Ты чаго гэтакая? — з выклікам спытаў малы. — Чаго гэтакая панурая? Ну, чаго?

Ён пакуль не мог назваць нейкім злым словам тое, што створана ім самім. Ён пакуль спадзяваўся, што яго заўжды пачуюць, што яму заўсёды ўсміхнуцца. Снегавая ж у адказ зацята маўчала. Відаць, яна зусім не хацела размаўляць з такім няўмелым хлопчыкам. Халодная. Абыякавая. Надта непрыгожая... Што і казаць, зусім не тая белая ўладарка з пачутай казкі!

«Можа, і сапраўды злосная», — падумаў тым часам і забыўся на белую ўладарку.

# ВЫКЛАДЧЫК У НУМАРЫ

Маленькі не мог ведаць, што ім забытая ўжо адчула біццё ягонага сэрца. І пацягнулася да цёплага, чулага, паўстаўшы снегавою... Няхай і гарбатай, няхай і касою. Яна ж не бачыла сябе збоку, а снягі для яе заўсёды былі прыгожымі.

— Злосная! Ты злосная! — крыкнуў між тым маўклівай снегавой бабе пакрыўджаны хлопчык.

Ён адвярнуўся ад свайго злепку, бо адчуваў сябе ніякава. Яго вучылі, што маніць — гэта дрэнна, нават калі рабіць тое самому сабе. «Злосны! Я — злосны!» — чамусьці раз-пораз нязгодна думалася малому, і з сэрца знікала такая звыклая цеплыня. Калі быць шчырым, то трэба было прызнацца, што гэта праз яго баба выйшла крывою. Але прызнацца было няпроста. Хлопчык хоць і быў чулым, ды ж ніводнага разу не быў смелым.

— Не бойся ты яе! — да хлопчыка падбегла такая ж маленькая дзяўчынка, знаёмая па вясёлых забаўлянках. — Гых! Страшная! Але не бойся! Не зачэпіць!

Кемлівая малая хоць і не бачыла, як была злеплена баба, але здагадалася пра тое праз сумна-пануры настрой свайго сябра.

— Ды я і не баюся! — не схацеў выглядаць баязліўцам хлопчык. — Вось жа не баюся ані кропелькі!

— Манюка! — засмяялася з яго дзяўчо. — Ах! Які ж ты манюка!

Хлопчык ужо хацеў крычаць, што гэта сама яна манюка і палахліўка, як раптам заўважыў у руках сяброўкі салодкую моркаўку, якую тая ўжо збіралася есці.

— Аддай! — пацягнуўся, каб забраць.

— Яшчэ чаго! Я сама! — заўпарцілася знаёмка і хутчэй адкусіла, відаць, не маючы намеру частаваць некага яшчэ.

— Аддай, кажу! — праявіў характар хлопчык. — І пабачыш, што зусім-зусім я не баюся!

Дзяўчынка сумелася і выпусціла моркаўку з рук. Малы падхапіў і хутчэй падскочыў да бабы. Хутка гарбатая і касая атрымала яшчэ і абгрызены маркоўны нос.

— Га-га-га! — заходзілася кемлівая. — Глядзі, якая брыдкая!

— Га-га-га! — адчуў сябе зусім смелым і яе сябра. — Якая няшчасная! Якая сляпая!

Баба сапраўды была сляпою. Маючы маркоўны нос, не мела вачэй-вугалькоў, а дзеці не спяшаліся іх прынесці. Бегалі. Смяяліся. І зусім не здагадваліся, што снегавая ўсё бачыла...

Яны ўздрыгнула, калі дзеці патрапілі ў яе першым снегавым камячком. Не, снегавая не магла баяцца снегу, гэта было б дзіўна...

— Глядзі! Зварухнулася! — ускрыкнуў уражлівы хлопчык, апусціўшы руку з другім камячком.
— Га-га-га! — адказала на гэта сяброўка, і яму чамусьці стала балюча.
— А вось табе! А вось табе! — пачаў з усяе сілы шпурляцца ў снегавую малы, каб толькі не адчуваць тое...
А вось табе... Ім абодвум пра нешта ціха рыпеў сняжок, калі, уволю накідаўшыся, набегаўшыся і насмяяўшыся, яны вярталіся дадому. Дружна трымаліся за рукі. Радаваліся. Не бачылі. Сініх зорных вачэй, якія пранікліва-ўважліва сачылі за іхнімі крокамі. Белыя снягі чулі, што хлопчык з дзяўчынкаю ўмовіліся заўтра пайсці на коўзанку.
А ноччу хлопчык сніў. Чароўныя белыя сані, якія са снежнай віхурай нёс па-над зямлёю магутны вецер, а ён, дарослы, вялікі, сядзеў у гэтых санях. Не, усё яшчэ як ёсць маленькі... Але не шмат і шкадаваў пра тое. Як можна было шкадаваць, калі побач з ім была... Няйначай, уладарка снягоў, няйначай тая, з пачутай дзівоснай казкі!
Дык гэта ж яна прынесла столькі снегу! І, мабыць, яе слухаецца сам вецер! А той, каму яна ўсміхнецца, знойдзе найдаражэйшы скарб! Малы так усцешыўся, што спалохаўся прачнуцца. Знікне ж тады чароўны сон. Адно ціха і ветла-ветла спытаў у белай:
— Скажы, калі ласка, куды гэта мы ляцім?
Уладарка паглядзела на яго і нічога не адказала, не ўсміхнулася. «Можа, яна не хоча падараваці мне скарб?» — падумаў хлопчык і ўжо хацеў пакрыўдзіцца. Як гэта яму не хочуць падараваць тое, пра што ён марыць? Праўда, пра той скарб ён марыў зусім крышку, а які ж ён — і не ўяўляў... Але ўсё ж!
Ці ведае ўладарка снягоў, што гэты скарб яму вунь як патрэбны! Няхай пазайздросціць тая задавака, з якой заўтра пойдуць на коўзанку. Ды і сам скарб... Каштоўны ж, пэўна! Хоць што такое каштоўнасць? Пра гэта трэба добра падумаць! Пакуль што найвялікшым скарбам для хлопчыка былі яго маленькія абшарпаныя саначкі, якія надзіва лёгка збягалі з горкі.
Уладарка цёпла ўсміхнулася. Чуйнае дзіця нават устрывожылася: а што, як белая растане, так і не паспеўшы падараваць яму скарб? Як быццам у той дзіўнай казцы згадвалася, што яна, снежная, баіцца цеплыні, а яшчэ сонца...
Праўда, сонца ані блізка не было. Маўкліва віхурылася завея, несла яго, хлопчыка, а з ім і сваю ўладарку, далей і далей. Халодна паблісквалі замерзлыя зоркі, але не маглі нагнаць марозу, хоць, відаць, і нямала хацелі таго. «Цікава, а ці слугуе табе мароз?» — падумаў пра белую ўладарку цікаўны да ўсяго незвычайнага хлопчык. Пра мароз у казцы не згадвалася нічога, як памятаў. А можа, памыліўся? Белая ўладарка быццам ад холаду сцепанулася. Дзіўна...

«Нібы тая снегавая баба», — падумаў хлопчык і прачнуўся. Ледзьве не заплакаў, не пабачыўшы побач з сабою белай. Але плач не плач, а сон заставаўся ўсяго толькі сном. Суцешыўся. Хутка паснедаўшы, малы выбег на вуліцу, патупаў па мяккай снегавой пярыне, няўзнак падышоў да ўчарашняй бабы. Сёння тая здавалася аж занадта скасавуранай, аж занадта злоснай... Быццам сама на яго пакрыўдзілася! Быццам сама ў ім расчаравалася!

— У-у-у! — сказаў ёй хлопчык і што сілы стаў штурхаць снегавыя камякі, якія так старанна катаў учора.

Нядоўга тыя пратрымаліся, пакаціліся, быццам мячыкі, аж зрабілася добра і весела. А калі нам і добра, і весела, то ўсе мы хочам дурэць на коўзанцы! І трошкі пабавіцца ў сяброўскіх гульнях, вядома ж. Хлопчык успомніў, дзе сёння абяцаў быць. Нядобра пазніцца... Але ж нібы штосьці замінала хутка спяшацца са сваёй весялосцю да іншых.

«Уладарка снягоў забылася падараваць мне скарб», — успомніў свой сон маленькі. Гэта быў усяго сон, але, няспраўджаны, засмуціў аж занадта. А скарб жа яму вунь як патрэбны... А для чаго? Проста патрэбны! Нават, займеўшы яго, не будзе больш сябраваць з той задавакай! Таму што ён мае скарб, а яна — не мае.

Скарбу пакуль што не было. Была добрая таварышка па гульнях.

— Паслухай, — спытаў хлопчык сваю сяброўку, як, сустрэўшыся, добра накоўзаліся і набегаліся, — а што за скарб хавае белая ўладарка?

— Белая ўладарка? З казкі? — задумліва перапытала дзяўчынка. — Ды хто ж яе ведае...

— А пра што ж там апавядаецца? Забыўся, — мусіў прызнацца цікаўны.

— А ў казцы гаворыцца, — па-даросламу павучальна мовіла маленькая, — што ўладарка снягоў узнагародзіць тым скарбам, які чалавек жадае займець. Адно трэба быць вартым...

— А што ж трэба для таго, каб выглядаць вартым? — цвёрда спытаў малы.

— Не выглядаць, а быць... А ты чаго раптам так захапіўся казкай? — з дарослай падазронасцю спытала дзяўчынка.

— Дык жа яно добра... Ведаць казкі!

— Добра, — даверліва пагадзілася ўлюбёная ў казкі, бо насамрэч думала, што захапленне казкай даруе ўсё.

Казкі ведаць добра... Увечары малы з цікавасцю слухаў адну, яе ціхім голасам распавядала бабуля. І быццам сузіраў тое сваімі вачамі: «А паўстае белая ўладарка з снягоў. Шукае сагрэтых цеплынёй вачэй, сагрэтых цеплынёй сэрцаў. Навошта ёй гэта? Кажуць, што незаўжды была яна зімою, вялікай і магутнай. Незаўсёды была несмяротнай... Некалі — зусім чалавечай...

Простай. Але паглядзелася ў халоднае люстэрка, адлітае самім марозлівым Зюзем — і стала зімовай. Што ж цяпер...».

Што цяпер, пра тое хлопчык не думаў, але зноў бачыў сон. Як раней, віхурай нясуцца сані, няспынна, імклівa, зусім не так, як сёння на коўзанцы... Ён побач з белай уладаркай. Сцішанай. Маўклівай. Сумнай. Не размаўляе з ім. Не абяцае скарбу. Пакрыўдзілася на яго? Чаму...

Чаму супыніліся сані? Прыехалі... Велічны замак на краі заснежанай зямлі, дзе ніколі не было цеплыні, куды ніколі не прыходзіла вясна. Адкуль ён ведае такое? Проста ведае... Гмахі. Сняжынкі. Люстэркі. Прыгожыя... І бярэ невымоўная цікаўнасць: а ў якое ж гэта халоднае люстэрка ты, белая, паглядзелася, што зрабілася несмяротнай?

— Хто гэта тут жыве? — асцярожна спытаў хлопчык, калі яны з белай уладаркай ужо падымаліся па бясконца доўгай ільдзістай лесвіцы.

— Хто жыве? Жыве... Жыве... — пераліўіста адгукнулася рэха.

Па-ранейшаму сумная ўладарка не азвалася ніводным словам. Ды малому не такім і жаданым стаў той адказ. Паланілі яго свет маляваныя ўзоры... Сінія ледзяныя іскрынкі. Бялюткія трапяткія снежкі. «Снежкі-ўсмешкі», — весела падумалася хлопчыку. А побач — застылыя людскія постаці. Нерухомыя, а як жывыя... «Хто ж яны?» — хацеў спытаць малы, але замінаў поўны расчаравання позірк белай уладаркі. Такі шчымлівы позірк...

«Мабыць, замерзлі, небаракі», — запознена пашкадаваў хлопчык, не надта каб жаллівa, бо мацней было адчуванне чароўнай казкі, у якую ён знянацку патрапіў. «Замерзлі ў гэтай чароўнай казцы», — міжволі мільгнула думка. — «А як такое можа быць?». Іскрынкі сінія-прасінія. Снежкі бела-бялюткія. Постаці людскія, бы тыя льдзінкі, празрыстыя...

— А такое можа быць тады, калі я цябе за нос ушчыкну! — весела прагучаў незнаёмы голас.

Проста і нечакана побач з’явіўся гэтакі дзед-барадзед, з якога ну ніяк нельга не засмяяцца. Расточкам роўны з хлопчыкам, рухавы ды жвавы, барада доўгая, аж да белай каўзучай падлогі. Ды не даў сябе як след і разгледзець, не тое што выбухнуць рогатам:

— А я ўшчыкну! За нос! — паабяцаў і пацягнуўся да малога.

Хлопчык лоўка адхінуўся ад учэпістых рук з кручкаватымі пальцамі.

— Яшчэ чаго! Ты хто такі і што тут робіш?! — адразу павысіў голас на гэтага дакучлівага дзеда.

— Авой! Які нявыхаваны хлопчык! — аж пакрыўдзіўся той, відаць, з-за таго, што яго не пазналі.

# ВЫКЛАДЧЫК У НУМАРЫ

— Гэта ж ты нявыхаваны! Як што якое, то адразу шчыкаеш за нос!
— Мне гэта можна! Я ж марозлівы... — ужо як быццам прымірэнча мовіў барадзед.
— Марозлівы? — хлопчык уважліва паглядзеў на яго, затым на белую ўладарку, што азвалася сваім звыклым маўчаннем, потым зноў на гэтага дасціпнага.
— Ты марозлівы! Ты — мароз! Зюзя! — здагадаўся ўраз малы, хоць пакуль не адчуваў холаду.
А што засвярбеў ушчыкнуты нос, такой бяды! Адно здзіўляе: як усё ж такі здолеў дацягнуцца...
— Хі-хі-хі! — здзекліва зайшоўся барадзед. — У мяне доўгія рукі! Дзе хочаш цябе дастану, абы зіма прыйшла... Вось яна прыйшла! — тыцнуў у белую ўладарку.
І зноў нічога не сказала! «Чаго ж ты гэтакая маўклівая?» — дапытліва глянуў ёй у вочы, як быццам нешта адчуўшы.
— Не глядзі! Не глядзі! — усхадзіўся барадзед. — Вось адна ўжо ў люстэрка глядзела-глядзела...
— І што з таго, як глядзела? – малы ўжо хацеў сварыцца.
— Глядзела-глядзела, глядзела-глядзела — і слова вымавіць не можа! — аж падскочыў марозлівы.
— Чаму ж гэта не можа? — здзівіўся яго добраму настрою хлопчык.
Гэта ж трэба! Такая прыгожая — і маўклівая... З чаго ж тут смяяцца?!
— Га-га-га! Якая няшчасная! Якая сляпая! — затросся з рогату маленькі Зюзя. — Ці зусім не такая ўжо і няшчасная?
Марозлівы сам дапытліва глянуў у вочы хлопчыку. Таму сказаныя словы здаліся як быццам знаёмымі... Але ж пэўна ўспомніць не змог...
— І не такая ўжо і сляпая! — сам сабе бурчэў Зюзя. — Цёплыя сэрцы бачыць і знаходзіць! Праўда, часам памыляецца, то, можа, і сляпая... Трошкі...
Мароз пыхліва-грэбліва адвярнуўся ад белай уладаркі і хлопчыка.
— Ну, і пра што ж ты марыш? — спытаў, ні да каго з іх не звяртаючыся.
— Пра скарб! – тут жа знайшоўся малы. — Пра скарб ад белай уладаркі!
— Га-га-га! А вось табе! А вось табе! — са звонкім прытупам па каўзучай льдзістай падлозе заскакаў Зюзя. — Кідаўся ў яе камякамі і чакаеш скарбу? Гэта ты дарма!
— Якімі камякамі? Калі ў яе кідаўся? — аж сцепануўся хлопчык. — Манюка ты! — кінуў, успомніўшы сказанае яму таварышкай па гульнях.
— А вось і не! Зусім не! — забегаў, замітусіўся туды-сюды марозлівы.
«І чаго я спалохаўся? — падумаў сам сабе хлопчык. — Ён жа мітуслівы, палахлівы, малы... А яшчэ і барадаты». Ну хіба ж можа такі нейкае кепства ўчыніць?
— А чым дакажаш? — сам тупнуў на Зюзю, аж падскочыўшы, хлапчынка.
— А дакажу! — малы барадзед балюча драпануў яго за нос.

Мабыць, ад гэтага хлопчык прачнуўся. Усхапіўся. Агледзіўся. Ні дзеда-барадзеда. Ні белай уладаркі. Адно нос моцна свярбіць, як быццам сам сабою па марозе гуляў, а не быў у цёплым ложку. «Скарб», — успомніў пра самае галоўнае. І з памяці ўсплылі словы, чуць якія было зусім нявесела: «Кідаўся ў яе камякамі і чакаеш скарбу», «Якая няшчасная! Якая сляпая!», «А вось табе! А вось табе!». Прыгадалася так няўдала злепленая ім снегавая баба... «А ты ўжо навошта?» — хацеў спытаць хлопчык, але спытаць не было ў каго. Нават у снегавой бабы, якую сам збурыў ушчэнт...

Скарб! Вось пра што раз-пораз успаміналася на коўзанцы і пазней, у вясёлых гульнях ды забавах. Гэта мароз валодае скарбам, а не белая, чамусьці пераканаў сябе хлопчык. Баю-баялася ў казцы пра ўладарчын скарб, але, відаць, мана ўсё гэта. «Манюка ты! Манюка», — усплывала ў памяці невядома да чаго. Заклапочана пытаўся ў сяброўкі:

— А скажы, — дзяўчынка амаль увесь час была побач, — халоднае люстэрка Зюзя змайстраваў?

— Зюзя! А хто ж яшчэ акрамя яго можа холадам дыхнуць, ваду ўледзяніць?

— Значыць, гэта ён зрабіў зіму зімою?

— Не! Гэта ён зледзяніў чалавечае сэрца белай уладаркі, — усё яшчэ верыла казцы дзяўчынка. — І стала яна зімою! Не марозлівай, не злою...

— А ўладарка, значыць, шукае ратунку? — як сам з сабою разважаў далей.

— Шукае! А хто ж бы яго не шукаў? — здзівілася малая. — Шукае сагрэтага цеплынёй сэрца, якое зможа яе вызваліць...

— Чаго ж гэта яна? Не жадае быць вялікай і магутнай? Не хоча быць несмяротнаю... Не цешыцца з красы белай-белай.

— Не хоча быць вечна маладою! Вечна прыгожай! — дзяўчынка кінула ў хлопчыка снегавым камячком. — Ох! Які ж ты незразумелы...

Незразумела, гэта праўда. А ўвечары цеплынёй дыхала добра натопленая грубка, бабуля ж звыкла распавядала ранейшую казку: «Стала зімовай, але і цяпер не здаецца, з надзеяй шукае цёплага сэрца белая ўладарка. Як знойдзе — радасцю вернецца да людзей. Прыйдзе яснай і жывою». «І болей не будзе на свеце белай радаснай зімы з такім мяккім іскрыстым снегам», — думаў абазнаны хлопчык. Не цешыцца болей на коўзанцы, не ляпіць снегавой бабы! Калі па шчырасці, то ляпіць снегавую малы не надта каб і жадаў, памятаючы мінулы раз. А коўзанка — гэта ж добра... «А белая ўладарка?» — як быццам зварухнулася сумленне. «Якая няшчасная!» — мроіліся колкія словы. І прыгожая, белая... Зусім не сляпая!

А ён, хлопчык, ці ж сляпы? Вось і казачны сон зноў вяртае яго ў велічны замак. Сумна там, бо няма побач белай… Дзе ж яна, дзе? Ёсць толькі гэты надакучлівы дзед-барадзед. Тупае туды-сюды, пра скарбы дзейкае, пра мары зноўку пытае. А што тыя мары… Ці зашмат іх? Да чаго ўсё…

— Хачу ў люстэрка тваё халоднае паглядзецца! — гаворыць малому малы.

— Не падманвай мяне, хлопча! — хітра ўсміхаецца барадзед. — Хочаш белую выбавіць! Спачувальны, цёплы!

— Ды не! Проста хачу паглядзецца! І стану такім жа марозлівым, як і ты!

— Як і я? Га-га-га! Добра, калі такім! — заходзіцца смяшлівы Зюзя. — А калі адным з такіх? — і паказвае на зледзянелыя людскія постаці.

— Ты не думай пра іх дрэнна. Проста аказаліся занадта цёплымі!

Ну як тут не сумецца? А дзед-барадзед рагоча, снегавым камячком, як сам хлопчык, трапна кідае. Адзін раз у яго, госця, патрапіць, другім разам — у нейкую зледзянелую… Тая дзын-дзын — і паб’ецца. Зусім.

— Ты чаго гэтакі? — пакрыўджана мовіць да барадзеда. — Ты чаго гэтакі злосны?

— Я злосны? Га-га-га! Я вясёлы, гуллівы і добры! А хто гэта расшкуматаў снегавую бабу? Га? Хто гэта быў?

Ну і што адказаць? А дзед-барадзед усхадзіўся, быццам сапраўдны мароз пад вокнамі. Рукой махне — і стрэлкі-ўзоры навядзе. Нагой тупне — і спавітыя снежнай аблямовачкай прасінія люстэркі срэбным галаском зазвіняць. Сцішна-жалобна, як бы плачучы…

— Глядзі, хлопча, хто дапраўды прыгажосць зімовую творыць! Гэта табе не бабу няўклюдную хоць як зляпіць! Сапраўднае майстэрства трэба… Масты ледзяныя каваць! Марозам усіх палохаць! Ды і сэрцы людскія халадзіць нялёгка… Ты вунь паспрабуй!

— Дык гэта… — нерашуча азваўся хлопчык, бо яго чамусьці стаў даймаць холад. — А белую ўладарку снягоў ты зляпіў?

— Можа, і я, — не стаў моцна хваліцца Зюзя. — Снежная-снежная. Вытанчаная. Зграбная. Чаго ж яшчэ?

Ну і чаго? Няма пэўнасці адказаць. Льдзістая, дзе ж яна падзелася? У яе самой запытацца б! Не, зусім не льдзістая… Хлопчык міжволі прыгадаў яе чароўную ўсмешку і сам ледзьве не ўсміхнуўся. «Злая! Марозлівая!» — чамусьці захацелася думаць пра яе так, як і пра Зюзю. Не, зусім не злая. І не марозлівая, трэба шчыра прызнацца. Снежка. Чароўная снежка… А чароўная — гэта якая? Трэба ў Зюзі даведацца!

— І пра што ж ты будзеш размаўляць з ільдзістай? — грэбліва пыхнуў Зюзя. — Ты лепш пра скарб падумай! Вось дзе пэўнасць!

Сапраўды. Скарб! Чароўны, снежны. І чамусьці з абліччам яе, белай уладаркі. «І навошта быў трэба нейкі скарб?» — хлопчык намагаўся прыгадаць. Не ўдалося. Каб не задавалася гэтая смяшлівая, надакучлівая? Як яе... Сяброўка-таварышка па гульнях.

— А ты зледзяні тую задаваку! Як яе? — абыякава пазірае Зюзя. — Будзе яшчэ адна белая... Будуць дзве белыя!

Няхай бы і так. Хлопчык уявіў смяшлівую і вясёлую вытанчанай, зграбнай. Маўклівай. І нечага скалануўся. Няхай і абрыдла сваім рогатам, але ўсё ж...

— Га-га-га! — звыкла падаў голас Зюзя.

«Ну і чаго ты зноў заходзішся?» — непрыхільна падумаў хлопчык. «Не разумееш, што зусім нецікава будзе гуляць з маўклівай?» — не было пэўнасці, як і раней. «А ці добра сам разумееш, што такое скарб?! Як сам яго знайшоў?» Маленькі нават разгубіўся. І аднекуль прыйшло веданне, што скарб увесь час хаваўся ў халодным Зюзіным люстэрку! Быў зусім побач...

— Малайчына! Здагадаўся! — радасна падскочыў Зюзя. — Ну чаго ўжо там... Паглядзіся! Або пан, або прапаў!

Пан. Прапаў. Хлопчык паволі рушыў да самай бліскучай, самай вялікай люстраной роўнядзі. Які там прапаў! «Станецца ўсё, як пажадаеш!» — мітусіцца побач малы марозлівы. Станецца. А як жа інакай! Адно скажы люстэрку сваю волю... «Скажу! Скажу!» Пачуццяў сваіх не адкрывай, не любіць іх люстэрка, абы-што робіць... «Пачуццяў сваіх не адкрыю!» Мабыць...

Чароўнае халоднае люстэрка, адлітае як быццам ім самім... Адкуль ведае пра такое? Гэтага ж быць не магло! Адкуль здагадваецца, каго ўбачыць у люстэрку... Снежную. Снегавую. Проста чароўную снежку. Не, проста прыгожую вяснянку, якая смяецца шчыра ягонай усмешкай. Патанае ў сонечнай цеплыні, у высокім блакіце, у сакаўной зяляніне, спявае звонкім голасам, кажа свету вітальную сілу. Мовіць яму самому прыязна:

— Вясна прыйшла! Сустракай вясну, мой хлопчык!





*Мяне заўсёды цікавілі пераклады і пераапрацоўкі, стылізацыя паэзіі, тэкстаў песень. Яшчэ ў дзяцінстве былі мае першыя спробы перакладаў, якія захаплялі сяброў і блізкіх. Таму ў гэтым кірунку я вырашыла развівацца. З кожным годам мае пераклады робяцца больш якаснымі дзякуючы набытым ва ўніверсітэце літаратурным і лінгвістычным ведам і няспыннай творчай дзейнасці.*

Анастасія Шчаглова

ФГіМК, 3 курс, 31-я гр.

**Борис Пастернак**

*Снежок*

*Ты в меня запустила снежком.*
*Я давно человек уже зрелый.*
*Как при возрасте этом моем*
*Шутишь ты так развязно и смело.*
*Снег забился мне за воротник,*
*И вода затекает за шею.*
*Снег мне, кажется, в душу проник,*
*И от холода я молодею.*
*Что мы смотрим на снежную гладь?*
*Мы ее, чего доброго, сглазим.*
*Не могу своих мыслей собрать.*
*Ты снежком сбила их наземь.*
*Седины моей белой кудель*
*Ты засыпала белой порошей.*
*Ты попала без промаха в цель*
*И в восторге забила в ладоши.*
*Ты хороший стрелок. Ты метка.*
*Но какой мне лечиться микстурой,*
*Если ты меня вместо снежка*
*Поразила стрелою амура?*
*Что мне возраст и вид пожилой?*
*Он мне только страданье усилит.*
*Я дрожащей любовной стрелой*
*Ранен в бедное сердце навылет.*
*Ты добилась опять своего,*
*Лишний раз доказав свою силу,*
*В миг, когда ни с того ни с сего*
*Снежным комом в меня угодила.*

Арыгінал

**_Сняжок_**

*Ты ў мяне запусціла сняжок.
Я даўно чалавек ужо сталы.
Як маёй маладосці глыток,
Вельмі смела ты пажартавала.
Снег забіўся ў самы каўнер,
Кроплі холадам коцяцца з шыі.
Снег, напэўна, у душу мне засеў,
І цяпер я юнацтвам заліты.
Дык чаго ж мы глядзім у далячынь?
Мы яе выпадкова сурочым.
Не збіраюцца думкі ў плынь:
Яны збіты сняжком тваім моцным.
Сівізны маёй белай кудзелю
Ты засыпала белай гурбою.
Той удар стаў адзіным з мішэнню.
Ты запляскала, радасці поўна.
З цябе добры выходзіць стралок.
Але дзе адшукаць паратунак,
Калі мне той халодны сняжок
Быў гарачай стралою амура?
Што мне ўзрост ды адбітак гадоў?
Ад іх толькі мацнеюць пакуты.
Рана ў сэрцы глыбокая. Зноў
Я каханнем навылет крануты.
Што хацела — здабыта табой.
Даказала ўсім сваю сілу,
Калі снежным мяне камяком
Нечакана тады адарыла.*



## Яна Барысевіч

ФГіМК, 4курс, 41- я гр.

**Любімая кніга:**
«Будзь воля Твая» Ірыны Жарнасек.

**Любімая цытата:**
«Вада і агонь, якія пярэчаць адно аднаму, мірацца на чалавеку: і вада ачышчае яго, і агонь таксама» (А. Разанаў).

**Крэда ў літаратурнай творчасці:**
Літаратурны твор павінен быць шчырым, інакш гэта проста падробка, імітацыя творчасці.

*«Творчасць — індыкатар, своеасаблівы дарожны знак: кожны раз яна паказвае табе самому, дзе ты цяпер і які ты цяпер». Гэтыя словы Алеся Разанава і раскрываюць самавыяўленне чалавека праз творчасць, паказваюць іх узаемаўплывы і ўзаемадзеянне. Асабіста для мяне пераклад з'яўляецца відам творчасці, своеасаблівым «перастварэннем» тэксту з адной мовы на другую.*

# БАТЛЕЙКА

S. A.

*Музыка або калядка.*

На небе з’явілася Зорка. Так. Цудоўная Зорка. Не падобная да астатніх. З шыкоўным, светлым хвастом — каметай. Толькі што той хвост паказаў на Бэтлеем, а дакладней на стаенку, якая на ўскрайку мястэчка. Ведаеце, чаму з'явілася гэтая зорка? Бачу, што ведаеце. Так, так, гэтая Зорка абвясціла свята нараджэння Збаўцы. Езус нарадзіўся, і ўзрадавалася ўсё неба. Хоры анёлаў спявалі ў Яго гонар, а Бог Айцец паслаў таксама на зямлю некалькіх Анёлаў, каб абвясцілі людзям і жывёлам пра нараджэнне Божага Сына. Паслаў да дарослых, да моладзі і дзяцей. А Зорка паказвала ўсім дарогу. На самым канцы хваста каметы малы праменьчык задумаўся: як ён можа дапамагчы людзям знайсці шлях да Збаўцы? Але ён адчуваў сябе такім маленькім і неістотным. Ён не думаў, што менавіта дзякуючы яму і іншым промням усе змогуць заўважыць дах стаенкі, у якой ляжаў Езус. Але цяпер шша. Цішыня. Анёл разбудзіў пастухоў. Дарослыя ўжо пайшлі. А дзеці...
*Музыка або калядка.*
Дзіця 1. Хутчэй, хутчэй трэба ісці.
Дзіця 2. Навошта спяшацца, і так бацькі будуць наперадзе. Яны ж пайшлі і нас пакінулі.
Дзіця 3. Вось-вось. Цікава, чаму яны нас пакінулі? Забыліся?!
Дзіця 4. Няўжо вы не чулі? Анёл жа ясна сказаў, што нарадзіўся Збаўца.
Дзіця 2. Анёл? Я нікога не бачыў.

Дзіця 1. Бо ты, як звычайна, спаў. Цябе нават воўк не разбудзіць.
Дзіця 3. Воўк не воўк, але што будзем рабіць?
Дзіця 1. Як што?! Ідзем за Зоркай.
Дзіця 3. Ну, у шлях. Хутка. Апярэдзім бацькоў. Пойдзем па кароткай дарозе.
*Музыка — калядка.*
Зорка свяціла. Анёлы спявалі. Маленькі праменьчык увесь час думаў як дапамагчы ўсім дайсці да Збаўцы, і яго малюсенькі агеньчык зліваўся з агнямі іншых промняў. Зорка свяціла, камета ззяла, і пастухі ішлі за яе бляскам. Але, як вы ведаеце, Анёл прыйшоў з добрай навіной таксама і для прыроды, для птушак. Уся іх чарада, пырхаючы, шчабятала, бо таксама хацела пакланіцца Езусу.
*Музыка — калядка.*
Птушкі. Цвір, цвір, цвір, Езус Малы. Заспяваем Яму, цвір, цвір, цвір.
Пастух 1. Кыш, кыш, што яны тут робяць?! Перашкаджаюць у дарозе.
Пастушка 2. Пакінь іх. Яны табе што, перашкаджаюць? Ты такі слабы, што нават верабей можа табе загарадзіць дарогу? Ха-ха-ха.
Пастушка 1. Паглядзі на майго мужа. Стаяў і глядзеў на птушак так, нібы ўпершыню бачыў іх у жыцці!
Пастух 2. Што вы, дурныя бабы, балбочаце? Бачыце, нават птушкі ведаюць пра нараджэнне Збаўцы.
Пастушка 1 і Пастушка 2 (разам). Ну, праўда, праўда.
Пастух 1. Такім чынам, у шлях. І вы, мае мілыя жанчыны, і ты таксама, мой сябра.
*Музыка — калядка.*
Зорка свяціла. Анёлы спявалі. І адзін з іх завітаў у Віцебск. Анёл падышоў да групы маладых людзей. Адзін ківае і крыўляецца, стоячы ў навушніках; другі глядзіць у смартфон і не бачыць нічога, акрамя яго; трэці курыць цыгарэту і абыякава глядзіць на іншых; а дзяўчына фарбуе вейкі перад люстэркам, занятая сабой. Толькі адзін звяртаў на яго ўвагу. Анёл завагаўся. Ці варта тут абвяшчаць добрую навіну? Але трэба. Такое ж было жаданне Бога. Анёл пакланіўся і абвясціў віцебскай моладзі аб нараджэнні Збаўцы. Але ў яго было такое адчуванне, што яго амаль ніхто не пачуў. Ну, місія выканана. Цяпер маладыя людзі самі вырашаць, што ім рабіць. Зорка свяціла. Маленькі праменьчык злучыў свой агеньчык з іншымі агнямі. І думаў, думаў як заахвоціць моладзь пайсці ў Бэтлеем.
*Музыка.*

Хлопец 1. Вітаю ўсіх. Вы бачылі?
Хлопец 2. Што бачыў? Адчапіся... Добра, слухаю.
Хлопец 1. Слухай. Тут быў анёл! Сапраўдны анёл.
Хлопец 2. Дзяўчаты, чулі? Яму з’явіўся анёл! Ха-ха-ха.
Дзяўчына 1. Ніякіх ха-ха-ха. Мы таксама бачылі. Паглядзі на мае вейкі. Такія файныя. Я якраз заканчвала фарбаваць, калі ён з’явіўся ў люстэрку.
Хлопец 2. Што за лухта! Які анёл? Можа, гэта люстраны анёл. Годзе. Лепш паслухайце мой смешны анекдот.
Хлопец 1. Бачыце, што ён вырабляе? Не верыць.
Хлопец 4. А ў што ён павінен верыць?
Хлопец 3. Дашлі відэа ў TikTok, тады ўсе пабачаць.
Хлопец 4. Гэта відэа прышпільнае. Ужо мільён праглядаў.
Хлопец 1. Я не вытрымліваю. Вы што, зусім звар’яцелі? Тут быў анёл!
Хлопец 4. Дашліце мне спасылку. Я пагляджу на гэтага анёла.
Хлопец 3. Якую спасылку? Тут быў сапраўдны анёл!
Хлопец 2. Хопіць дурніцца з гэтым анёлам. Ну, скажы. Што ён хацеў?
Хлопец 3. Каб мы пайшлі за Зоркай. Нарадзіўся Збаўца. Мы павінны пакланіцца Яму.
Хлопец 1. Так. Менавіта так. Мы павінны ісці. Паглядзіце на Зорку.
Хлопец 2. Ты сур'ёзна? На небе зорка, ды і днём?
Хлопец 4. Гэта лепш, чым усё. Нічога сабе, зараз здыму.
Хлопец 1. Не дурніся. Пайшлі.
Хлопец 4. А яна бачыла?
Дзяўчына 2 (тушыць цыгарэту). Ну, дык нарэшце хтосьці заўважыў мяне. Тут нешта было. Накшталт анёла, але ў гэтым дыме. Я не ўсё бачыла. Аднак варта праверыць. Будзе з чаго пасмяяцца.
Хлопец 3. Табе лепш прычасацца для гэтай сустрэчы. Ты выглядаеш жахліва.
Дзяўчына 2. Сачы за сваімі вейкамі, мне мае цалкам падабаюцца.
Хлопец 1. Ну, хопіць. Ідзем.
*Музыка.*
Зорка свяціла. Камета ззяла. Маленькі праменьчык зліваў свой агеньчык з іншымі агнямі, а да стаенкі ішлі дарослыя, іх дзеці, птушкі і моладзь з Віцебска. Анёлы спявалі, а пасланцы ад Бога думалі, што будзе, калі ўсе дабяруцца да Езуса. Ці будуць яны працягваць спрачацца? У рэшце рэшт, Езус — гэта сама любоў.
*Музыка.*

Мужчына 2. Бачыце, там нехта ідзе. Апярэджвае нас.
Жанчына 2. Што ты там бачыш? Ты зноў напіўся? Я табе як дам зараз. Мы ідзём да Збаўцы, а ты п'яны!
Жанчына 2. А ты што? Ты таксама нешта бачыш? Вы абодва выпілі? Ах ты, вырадак!
Мужчына 1. Дурныя бабы...
*Музыка.*
Хлопец 1. Бачыце Зорку?.
Хлопец 4. Вунь яна. Але што гэта за крыкі?
Хлопец 2. Нейкія людзі лаюцца.
Хлопец 3. Цікава, што там здарылася?
Хлопец 1. Можа, трэба ім дапамагчы?
Хлопец 2. Быццам дарослыя будуць нас слухаць?!
Хлопец 4. Яны ўжо далёка і, здаецца, памірыліся.
Хлопец 3. Ну, у шлях. Толькі ведаеце што? Мы пойдзем так, з пустымі рукамі? Думаю, нешта трэба аднесці.
Хлопец 4. Я пакажу Яму супервідэа — Ён усміхнецца.
Хлопец 2. Што там за відэа? Яно для малога. Мая музыка — вось гэта трэш.
Хлопец 1. Музыка? Твая музыка? Гэта толькі крык. Вось у мяне нешта ёсць. Я раскажу яму гісторыю Беларусі. Ведаю як свае пяць пальцаў.
Хлопец 2. Зубрыла. Знайшоўся разумнік! Гэта не для дзіцяці. Зрэшты, гэта проста нуда.
Дзяўчына 2. Я прапаную цыгарэту. Гэта будзе нешта.
Хлопец 3. Годзе. Ніякіх смартфонаў, ніякіх гістарычных прамудрасцяў і, крый Божа, запалак і цыгарэт.
Дзяўчына 1. І ніякай касметыкі для павек?
Хлопец 1. Так. І не тушы для павек. Патрэбна нешта ад сэрца. Наша, сапраўднае.
Хлопец 4. Дык што будзем рабіць?
Хлопец 2. Можа быць, нашу музыку, такую, як ... Ну, ведаеце, так проста, па-нашаму.
Хлопец 4. Ведаеш, гэта класная ідэя. Трэба толькі паспрабаваць, каб усё атрымалася.
Хлопец 2. Усе згодныя?
Хлопец 1 і Хлопец 3 (разам). Згодныя.

*Музыка.*

Воўк. Ціха. Ціхенька. Ні гука. Бачыце гэтых дзяцей? Ідуць і ідуць, і такія тлусценькія. Ням-ням.

Дзіця 1. Бачылі?

Дзіця 2. Я нічога не бачыў.

Дзіця 1. Як звычайна ты спіш, нават калі ідзеш.

Дзіця 2. Я не сплю. Проста думаю.

Дзіця 1. Калі будзеш працягваць далей так думаць, дык воўк цябе з’есць.

Дзіця 3. Я таксама бачыў.

Дзіця 2. Што ты бачыў?

Дзіця 3. Ну, ну бачыў... воўчы хвост.

Дзіця 2. Яшчэ чаго?. Воўчы хвост!

Дзіця 1. А я бачыў усяго ваўка.

Дзіця 3. Трэба ўзяць палкі і прагнаць яго.

Дзіця 3. Ну, не ведаю. А калі ён кінецца на нас?

Дзіця 1. На нас?! Паглядзі, як нас шмат. Дадзім рады.

Пастухі. На ваўка...

*Музыка.*

Зорка свяціла. Камета ззяла. Маленькі праменьчык злучаў свой агонь з іншымі агнямі. Пастушкі гналіся за ваўком. Моладзь спрабавала разам штосьці зайграць. А дарослыя ўжо перасталі сварыцца.

*Музыка — калядка.*

Жанчына 2. Не сярдуй на мяне, любімы муж. Неяк так атрымалася. Я не павінна была крычаць.

Жанчына 1. І я таксама дарэмна крычала. Што, Сашка? Будзем жыць у згодзе?.

Мужчына 1. Добра, згода. Як я магу злавацца на сваю прыгажуню?

Мужчына 2. Згода, згода, але там, за дрэвам, я бачу ваўка. Я думаю, ён хоча птушак выкрасці.

Жанчына 2. Ну, тады мы яго прагонім!

*Музыка.*

Дзіця 1. Ваўка ўжо няма. Але раскажы, пра што ты так думаў?.

Дзіця 2. Ведаеце, ідзём мы да Дзіцяці. І што мы Яму дадзім? У нас жа нічога няма!

Дзіця 3. А давайце станцуем для Езуса?.

Дзіця 1. Так як заўжды?

Дзіця 2. Так. Як заўжды.

*Танец і музыка.*

Мужчына 1. Чуеце? Гучыць музыка, як у нашых дзяцей.
Жанчына 2. А дзе яны? Я зусім пра іх забылася.
Жанчына 1. Вой-вой-вой. Яны ж засталіся адны! Воўк іх з’есць!
Мужчына 2. Ваўка прагналі ў той раз. Двое старэйшых з дзяцей бачна. І трэцяе, здаецца, відаць. Скончылі танцаваць.
Жанчына 2. У такім разе, хутчэй у дарогу за імі.
Мужчына 1. Пачакайце, пачакайце. Дзеці станцуюць, а што мы дамо Езусу?
Жанчына 1. Як гэта што? Мы таксама станцуем.
Мужчына 2. А як? Мы ж не ўмеем танцаваць.
Жанчына 2. Станцуем як хто можа.
Мужчына 1. Я не ўмею.
Жанчына 1. Ну, паўтарай за мной.
Мужчына 2. Хопіць. Няхай так будзе... Ідзем, а то дзеці нас апярэджваюць.
*Музыка.*
Хлопец 1. Нічога з гэтага не атрымаецца.
Хлопец 2. Бо не захоўваеш рытму.
Хлопец 1. Сам ты не захоўваеш рытм. У мяне 10 па музыцы.
Дзяўчына 1. За прыгожыя вочы і зазубраную тэорыю.
Хлопец 4. Перастаньце сварыцца. Езус — гэта Любоў, а не пастаянныя сваркі.
Хлопец 3. Давайце пачнем з самага пачатку. Гэта проста, толькі трэба слухаць адзін другога.
Хлопец 2. А ён выхваляецца.
Хлопец 4. З гэтага нічога не выйдзе. Я пакіну смартфон, ён — навушнікі, ты — свае амбіцыі выдатніка і супакоімся. Усё будзе добра.
Хлопец 2. Ну, трэба было б яшчэ цыгарэту пакінуць, а яна каб пра вейкі забылася.
Хлопец 3. Вось, менавіта.
*Музыка.*
Зорка свяціла. Анёлы спявалі.Усе вандравалі. Езус з Марыяй і Юзафам чакалі гасцей. А камета. Камета ззяла. А яшчэ свяціў з усіх сіл маленькі праменьчык, які злучаў свой агонь з іншымі агнямі ў камеце. І ён думаў, што зрабіць, каб усе падышлі да Малога і пакланіліся Яму.
*Музыка — калядка.*
Птушкі. Цвір, цвір, цвір, Езус Малы. Заспяваем Яму, цвір, цвір, цвір.
Маці Божая. Дзякуй вам, птушкі. Езус усміхаецца вам. І вам, маленькія пастушкі. Ён бачыў, як вы выдатна танцуеце для Яго. А вы, пастухі, што хочаце падарыць Немаўляці?

Мужчына 1. Ну, мы. Мы...
Жанчына 1. Мы станцуем.
Жанчына 2. Ну так, крыху па-свойму.
Мужчына 2. Ад усяго сэрца, як умеем.
Маці Божая. Вы добра танцавалі. Дзякуй. Дзякуй. А вы, беларуская моладзь. Вы таксама хочаце патанцаваць?
Хлопец 2. Мы задумаліся.
Хлопец 1. І нават крыху паспрачаліся.
Хлопец 3. Але мы памірыліся.
Хлопец 4. Хочам граць для Езуса.
Маці Божая. Як прыгожа, калі ўсе граюць ва ўнісон. Царства майго Сына напоўнена любоўю і згодай. Але бачу, што хтосьці яшчэ зазірае. Баіцца. Не бойся, воўк. Калі ты нікога не хочаш пакрыўдзіць, то і табе ніхто не ўчыніць крыўды.
Воўк. Я нічога не прынёс Езусу. Але я абяцаю быць ветлівым і не крыўдзіць дзяцей.
Маці Божая. Дзіцятка Езус радуецца гэтаму і дзякуе вам усім.
І зорка ззяла. Камета ззяла. І маленькі праменьчык быў вельмі рады, бо ўсе прыйшлі і Маленькі Езус быў усцешаны. Праменьчык нарэшце зразумеў, што зрабіў сваю працу выдатна, бо ён злучыў свой агонь з іншымі промнямі, і гэта дало менавіта такое святло, каб ніхто не заблукаў па дарозе да стаенкі. І ты будзь такім маленькім праменьчыкам! І ты паказвай шлях да Езуса разам з іншымі ў гармоніі і любові, якія злучылі дарослых, моладзь і дзяцей! Няхай Дзіцятка Езус блаславіць усіх нас!
*Калядка.*





## Сафронова Ксения

Учащаяся 2 курса специальности «Музыкальное образование».

***

Шёл по улице щенок, бедный,
маленький, холодный.
Тот щенок был одинок, он бездомный
и голодный.
Шёл, куда глаза глядят, а верней —
куда шли лапы,
Чёрным пятнышком хвоста он
размахивал, как шляпой.

Ветер спрашивал его: «Ты чего
грустишь, дружище?
Хочешь, я с тобой сейчас поделюсь
своею пищей?»
Спрятав свой потешный нос, он
хвостом вильнул игриво,
Не ответив на вопрос, он, дрожа,
помчался мимо.

Я хочу собрать всех-всех щенков! Всех
родных и очень разных.
И хотя бы раз в году им устроить
добрый праздник.
Пусть хотя бы только день не таскают
их за уши!
И когда уж, наконец, мы поймём, что
они имеют души!

## *Чувство любовь*

Недосягаемое чувство любовь
Достигает нас вновь и вновь.
Иногда она взаимна, иногда
больна,
Но чаще всего одна.

Задумайся ты, оглянись!
Вокруг тебя целая жизнь!
И если тебя сломали однажды,
Не значит, что будет так дважды.

Но как же до вас достучаться?
Вы не одни, посмотрите!
Возможно, с вами нужные люди.
Возможно, вы лишних смешите.

Любите, как только хотите!
Давайте любить другим.
И помните вы, что с вами
Всегда будет ваша жизнь.



**Касатая Дарья**

Учаящася 1 курса
специальности
«Начальное
образование».



**Беспальчик Сергей**

Учащийся 3 курса специальности «Начальное образование».

***

Собирая жизнь по частицам,
Разбросанным по углам,
Мы выстраиваем границы,
Удобные только нам.
Глядя в чужие лица,
В поисках черт родных,
Мы выстраиваем границы,
Удобные для нас самих.
Если же нам интересно
Мнение со стороны,
Мы убираем границы —
Они теперь не нужны.
И много людей бывает
Жадных, пустых, скупых,
Границы других разрушая,
Строят выгодные для них.



**Картовенко Ольга**

Учащаяся 2 курса специальности «Начальное образование» .

## *Мои друзья*

Мои друзья — поддержка и опора,
Моё плечо — я не ищу других.
Они со мной и в радости, и в горе.
На свете нет родней и ближе их.
Они и успокоят, и поймут,
И дельные дадут советы,
И ничего не требуя при этом.
На помощь своевременно придут,
Откроют сердце, даже не осудят.
Предложат чай на кухне не спеша.
Как здорово, что есть такие люди
Теплом и светом их наполнена душа.
Хочу, чтоб только поровну достались
Нам радость, счастье, горе и беда,
Чтобы товарищи мои со мной остались.
Я счастлива, что рядом есть друзья.

## *Не губите природу*

Здесь лентой синею плыла речушка,
На берегу её рос небольшой лесок.
Любили птицы здесь селиться, и кукушка
Оттачивала звонкий голосок.

Сюда ходили люди за водою,
Не раз она спасала от жары.
Был этот край наполнен тишиною,
Плотину здесь построили бобры.

Но вдруг однажды всё здесь изменилось:
Пригнали технику, пришли чужие люди.
И в одночасье всё тут превратилось
В пугающе пустынное безлюдье.

Здесь возвели огромнейший завод.
Куда ни глянь - везде одни отходы.
Теперь всё в едком дыме целый год,
Ну а кому-то главное - доходы.

А виноват ведь в этом человек:
Бездумно разрушая, год от года,
Не замечая в свой бездушный век,
Что жертвою становится природа.

## ***

Привет, я пишу тебе это последними каплями.
И перо всё истёрлось за числами слов.
Моя армия слёз не расправилась с тварями.
Может быть, в моём мире закончилась кровь.
Я не требую помощи, ты не волнуйся.
Капель с перьями нет, но зато есть роса.
Только я попрошу — ты в подвале закройся.
На наш мир надвигается буря, гроза.
Их задержать не смогу, сейчас кончилось солнце.
А луну совсем скоро должны привезти.
Но, когда я приеду, давай без эмоций.
Просто путь мне домой добротой освети.

## *Зима*

Трещит мороз, темно и страшно.
Всё по домам своим сидят.
На улице сейчас опасно
И все об этом говорят.
Но нас не тронет ужас,
Мы здесь, с камином и теплом,
И планы всех чертей обрушась
Так и не тронут нас вдвоём.
Горячий чай, пирог с малиной...
Ты это любишь, я-то знал!
Недавно ты слегла с ангиной,
Твой кашель гром напоминал!
Теперь же ты уже здорова,
Но я волнуюсь до сих пор.
Пускай нам это и не ново,
Устало падаю я в сон.
А ты сидишь ещё, рисуешь, —
Меня рисуешь, знаю я —
И по весне нашей тоскуешь,
В ней так жива твоя душа.



**Стародуб Татьяна**

Учащаяся 1 курса специальности «Дошкольное образование».



**14 лютага споўнілася 130 гадоў з дня нараджэння Канстанцыі Буйло. Творчасць паэтэсы прасякнута глыбокімі пачуццямі да народа, Бацькаўшчыны. А філасофская і інтымная лірыка Канстанцыі Буйло насычана шчырасцю. Вершы паэтэсы не пакідаюць чытачоў раўнадушнымі. Многія з іх пакладзены на музыку, а такія творы як песня «Люблю» набылі асаблівую вядомасць.**

***Мяцеліца***

*Праз пустыя бязмежныя гоні*
*Скачуць лёгкія белыя коні...*
*Ветрагонныя звоняць капыты,*
*Шкляным звонам ільдзістым падбіты.*

*Еду, еду па беламу полю,*
*А віхура дарогу заносіць.*
*Яна ўслед мне так страшна галосіць,*
*Быццам сэрца заходзіцца з болю.*

*У даль лятуць мае белыя коні*
*Па пустым бездарожным загоне.*
*Пераблытаў ім вецер гуллівы*
*Легкавейныя, тонкія грывы.*

*Поле снегам сыпучым пакрыта,*
*Звоняць звонам ільдзістым капыты...*
*І куды я загублена еду*
*Без пуці, без напрамку, без следу?!*

Падрыхтавала
Шчаглова Анастасія

Оксана Великанова, ФГиЯК, 203-я гр.

# Кто такая Анна Каренина в пантеоне богов?

Согласно теории К.Г. Юнга, в коллективном бессознательном хранятся основные модели поведения, которые в свое время были отражены в древнегреческих мифах. Такое соответствие неслучайно, в жизни постоянно разыгрываются сцены из мифов, которые также были созданы в процессе наблюдения за жизнью. Так, при чтении романа «Анна Каренина» можно заметить черты как характера, так и внешности героев, которые соотносятся с характеристиками древнегреческих богов.

Главная героиня, Анна Каренина, в произведении описывается как женщина, выглядящая моложе своих лет. Походка ее была быстра и легка, несмотря на довольно полное тело. Волосы черные, вьющиеся, постоянно путающиеся. Ее серые блестящие глаза, казавшиеся темными от густых ресниц, и едва заметная улыбка, украшающая румяные губы на ее «коже цвета слоновой кости» придавали Анне особую «прелесть». Толстой довольно часто использует эпитет «прелестна» в описании Карениной, но добавляет, что: «...было что-то ужасное и жестокое в ее прелести». Все эти черты в совокупности напоминают образ Персефоны. Женщины с психотипом Персефоны не только выглядят моложе своего возраста, но и ведут себя так же, требуя заботы и опеки. Вероятно, это вызвано недостатком внимания в детстве, как в случае с Анной, ведь она воспитывалась не родителями. Поэтому ей всегда не хватало внимания сначала Алексея Каренина, а затем и Вронского.

Оставив законного мужа ради Вронского, Анна теряет свою славу в глазах высшего общества, в котором еще недавно была так уважаема и любима: «Я знаю, что меня в моем положении не может принимать ни одна порядочная женщина». Теперь Анна уже не часть светского общества, она принадлежит другому миру, так же, как и Персефона, украденная Аидом, отныне принадлежит совершенно другому миру и обществу. Персефона старается создать свой собственный мир в царстве Аида. Так и Анна Каренина, оказавшись в тяжелой ситуации, когда ей мало внимания и заботы, старается жить в своей иллюзии, созданной с помощью морфия: «И так же, как прежде, занятиями днем и морфином по ночам она могла заглушать страшные мысли о том, что будет, если он разлюбит ее».

Илария Мартынова, ФГиЯК, 203-я гр.

# Прочитала «Бесприданницу» А.Н. Островского

Тема данного произведения актуальна для человека XXI века. Время, которое описывает автор, — это новые порядки в стране, время становления нового класса, развития экономики, моды на искусство, театры и выставки. То же самое происходит и сейчас: история циклична и подобные изменения характерны для каждого нового её витка. Однако, если вместе с автором заглянуть в глубь человеческой личности того времени, то можно увидеть присутствие подлости и жадности. За мнимым спокойствием скрываются корыстные денежные расчеты и небывалый цинизм. Тема финансов проходит через всё произведение. Финансы обозначают социальный статус героев, являются мотивом для их поступков, позволяют получить реальную власть над людьми и влиять на их судьбы. Но самый главный мотив, проходящий через всю пьесу, — торг за Ларису.

Мать Ларисы, Харита, выдает своих дочерей замуж за выгодные деньги. Впоследствии она теряет всех своих дочерей. И это даже не проклятье рода, а простая жадность и желание достичь былого богатства. Для меня персонаж Хариты Игнатьевны совершенно непонятен. И если можно хоть как-то объяснить намерения и поступки жадных мужчин, то как понять действия матери по отношению к своим родным дочерям? Лариса Дмитриевна была человеком, которого совершенно не интересовали деньги. Конечно, ей нравились дорогие наряды, дорогие вещицы, ей хотелось полететь в Париж, но всё это желания обычного человека.

Как человек XXI века, уже имея все блага цивилизации и права (т.е. мне уже не нужно приданое, чтобы выйти замуж, моим родителям не надо выдавать меня за богатого мужчину, чтобы повысить свое положение в обществе), я хочу сказать, что понимаю только Ларису с её безумным желанием жить, рвением к творчеству и к своему возлюбленному. Я не могу представить, как бы моя мать выдавала меня за любого мужчину, не думая о моем счастье. Или как я совершаю «подвиг», идя под венец с первым встречным.

Подводя итог, я хочу повториться: в этой пьесе люди делают всё ради денег. Они предают себя, мораль, своих возлюбленных, убивают. И мы понимаем, что счастья ни у кого как не было, так и нет. Перейдя порог морали ради состояния, люди очень дорого заплатили. И самое обидное, что в любую эпоху истории можно выкрутиться, заработать денег или тот самый социальный статус, уважение, но герои выбрали «легкий путь» и остались у разбитого корыта.

Егор Рябиков, ФГиЯК, 203-я гр.

# Размышляя над романом Ф. Фицджеральда «Великий Гетсби»

Главная ценность, притягивающая деньги в "Великом Гэтсби — человеческое желание добиться чего-либо. У Гэтсби главным желанием было вернуть в свою жизнь Дейзи. Таким образом, Гэтсби зарабатывал ради любви. Но у него есть и другая сторона, ведь Гэтсби ещё и носитель идеалов общества «потребления» во всем их показном величии и блеске. Эта сторона изменила его мышление.

Вторым, в своеобразной пирамиде ценностей, пунктом является «Американская мечта». Если в Гэтсби сочетаются полярные начала, то в Томе Бьюкенене и ему подобных постоянно подчеркиваются одни и те же черт— крайняя самоуверенность, вера в собственную исключительность, физическая сила, «крепкий» индивидуализм и прикрытое красноречием невежество. И Том, и Дэйзи — обладатели большого состояния с рождения, поэтому их мораль, представление об общечеловеческих ценностях определяются их принадлежностью к классу богачей, для которых нравственное растление других людей, а подчас и их гибель — явление вполне нравственное (смерть Миртл, случайное убийство невиновного Гэтсби).

Простое человеческое желание спокойно и хорошо жить также нашло себе место в списке ценностей человека романа «Великий Гетсби». И оно не на третьем месте после американской мечты, но вне списка в целом. Это желание заставляет нас изо дня в день идти дальше, работать и становиться лучше, ведь в конечном итоге лучшая версия нас заработает достаточно денег для спокойной и хорошей жизни. Если выбирать одного героя романа для этого пункта, я выберу Ника Каррагуэя.

Таким образом, достигнув пика богатства, деньги теряют свою былую ценность как средства достижения целей, отчего и цели не всегда продолжают иметь смысл. Та же современная американская мечта имеет свой смысл до момента её достижения — получения богатства и, соответственно, свободы. Но есть и другие ценности — те, что не всегда зависят от богатства или для достижения которых богатством можно считать не финансы, а чувства и мысли.

Ванесса Юнгвирт, ФГиЯК, 203-я гр.

# Человек в мире денег

Роман «Шагреневая кожа» посвящён проблеме столкновения неискушённого человека с обществом, кишащим пороками. «Шагреневая кожа», по словам Бальзака, должна была показать тот век и жизнь того времени. По мнению автора, деньги губят людей. Под влиянием золота происходит постепенная деградация души. Душа человека спрятана в бумажнике банкира. Многие люди жили на копейки, они пытались, грубо говоря, просто выжить. И все старались справиться с этой проблемой по-разному. Кто-то брал себя в руки и начинал работать, а кто-то сдавался и готов был даже на самоубийство, как главный герой Рафаэль де Валентен. Меня поразило то, что, читая это произведение, я понимала, что такие же ситуации существует и в современном мире. Людям всегда не хватает денег, все хотят быть богатыми. Деньги являются потребностью человека. Их власть очень велика, потому что сильна вера людей в эту власть, и это неудивительно. Существует грань между деньгами и человеком, которую нельзя переступать. Рафаэль де Валентен был человеком, которого погубили деньги, желания и роскошь. Он был слугой этих богатств.

На протяжении чтения произведения «Шагреневая кожа» я чувствовала злость и жалость одновременно. Я просто была в шоке от того, что делают деньги с людьми из-за неправильного отношения к ним. Я несколько раз смогла убедиться, что это проблема всех людей. Но жалость у меня возникала ещё и от того, что Рафаэль сам погубил свою жизнь. Деньги он поставил на первое место. Ему казалось, что без них жизни нет. По моему мнению, самое главное в нашей жизни — это здоровье, понимание и любовь любимых и близких людей. Деньги играют не такую значительную роль, как мы считаем.

Меня поразил образ и смысл самой шагреневой кожи. Она является символом выбора. Человек сам устраивает свою судьбу. Ведь не деньги разрушили жизнь Рафаэля, а он сам, точнее его отношение к ним. По моему мнению, деньги даны нам не только для удовлетворения потребностей, но ещё как проверка людей на жадность, расточительность, экономность и т.п. Я полностью разделяю мнение автора о том, что человек не имеет право бездумно потакать своим прихотям, жить в погоне за наслаждениями, не задумываясь ни о чём.

После прочтения этого произведения, я не могу сказать, что поддерживала и понимала поступки Рафаэля де Валентена. Все поступки человека являются его выбором и желанием. Они характеризуют его. И поэтому я могу отметить, что главный герой всё делал так, как хотел. Нельзя обвинять во всём деньги, так как получив их, человек сам решает, как с ними обращаться. Деньги — это что-то неживое, они не могут ничего сделать, значит, всё зависит от человека, который их имеет. Нельзя зависеть от денег. Малое количество денег не означает конец жизни. Их всегда можно заработать честным трудом. Бальзак, показав человека в мире денег своего времени, указал на человека и в современном мире. Главная проблема — это наше отношение к деньгам. Отнюдь не деньги делают человека скрягой или мотом. Лишь сам человек определяет, что для него является главной ценностью. Пока человек жив, не поздно пересмотреть свою позицию. Потому что и время жизни тает подобно шагреневой коже.



Дана Карповіч, ФГіМК, 22-я гр.

# Геніяльны твор кожнага народа — гэта яго мова

*Менавіта пад такой назвай 21 лютага ў ВДУ прайшло мерапрыемства, прымеркаванае да Міжнароднага дня роднай мовы.*

Ініцыятарам святочнай праграмы выступіў факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый сумесна з аддзелам студэнцкай творчасці і культурна-забаўляльнай дзейнасці, а таксама студэнтамі факультэта навучання замежных грамадзян.

Выкладчыкі, студэнты, ліцэісты, супрацоўнікі і госці ВДУ сабраліся ў фае другога паверха. Мерапрыемства пачалося з віншавальнага слова рэктара ўніверсітэта. Валянціна Васільеўна Багатырова адзначыла, што свята важнае як для беларускіх студэнтаў, так і для замежных, а ўсе мовы вельмі прыгожыя. Выступленне рэктар завяршыла ўрыўкам з песні «Беларуская мова» гурта «Дразды».

Затым слова ўзялі студэнты спецыяльнасці «Беларуская філалогія» і прапанавалі адгадаць беларускія прыказкі.



Калі ўдзельнікі паспяхова справіліся з загадкамі, студэнты прапанавалі ім пазнаёміцца з народнай гульнёй «Яшчар».

Яна была распаўсюджаная на Пастаўшчыне ў мінулым стагоддзі, а затым пераняла ўдзельнікамі фальклорнага калектыву вёскі Гута. У 2018 годзе арганізацыя ЮНЕСКА ўнесла гульню «Яшчар» у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Задума паставіць «Яшчара» на факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый з'явілася яшчэ ў мінулым годзе, калі мая аднагрупніца пазнаёміла нас і Вольгу Іванаўну Русілку з гульнёй.

# ПАДЗЕІ НА ФГІМК

Ідэя была падтрыманая Аксянчук Ганнай Яўгенаўнай і Падстаўленка Віталем Феліксавічам. Студэнтка 22 групы Вялічка Караліна дапамагала з пошукам матэрыялу і стварэннем сцэнарыя. Мне пашанцавала стаць удзельніцай гульні. На першай рэпетыцыі мы глядзелі відэавыступлення фальклорнага калектыву вёскі Гута, каб мець ўяўленне, як праходзіла гульня. На астатніх вадзілі карагод і вучылі абрадавыя песні. Было шмат рэпетыцый, якія праляцелі хутка.

Настаў дзень выступлення. Спачатку вядучыя распавялі, што гульня ўзыходзіць да славянскай ранняй культуры язычніцтва, Яшчар з'яўляўся сімвалам урадлівасці. Вобраз Яшчара ў беларускай народнай гульні быў яшчэ і сакральным сімвалам дзявочага сталення. Затым мы вадзілі карагод з песняй-ухваленнем, а Яшчар у гэты час зрываў хусткі, якія мы выкуплялі беларускімі песнямі і вершамі. Дапаўненнем да гульні стала казка «Каза ў арэхах» у выкананні студэнтаў трэцяга курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія».

Напрыканцы мерапрыемства гледачы разам з удзельнікамі гульні вадзілі карагод пад песню «Сланечнік» гурта «Дразды». Мерапрыемства выклікала шмат пазітыву. А мы радыя, што цяпер з'яўляемся носьбітамі беларускай народнай гульні.




Фотаздымкі ўзяты ў суполцы «Медыяцэнтр ВДУ»

**Ужо ў дзясяты раз *15 сакавіка* пройдзе традыцыйная акцыя факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый *«Праз дыялог моў — да душы, да сэрца»*, якая прымеркавана да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Упершыню акцыя прайшла ў 2013 годзе для студэнтаў тады яшчэ філалагічнага факультэта.**

**У мінулым годзе замест дыктанта пісалі сачыненне на рускай або беларускай мовах на тэму «Па праву памяці жывой». Сёлета плануецца вярнуцца да традыцыйнай формы правядзення. Адметным з'яўляецца тое, што да акцыі далучацца нашыя ВНУ-партнёры, а ў самім дыктанце будзе прысутнічаць шмат безэквівалентнай лексікі беларускай мовы.**



Фотаздымак ўзяты ў суполцы «Ф-т гуманітарыстыкі і моўных камунікацый»

## В 2023 ГОДУ ФАКУЛЬТЕТ ГУМАНИТАРИСТИКИ И ЯЗЫКОВЫХ КОММУНИКАЦИЙ ПРИГЛАШАЕТ СВОИХ БУДУЩИХ АБИТУРИЕНТОВ ПОСТУПАТЬ НА СЛЕДУЮЩИЕ СПЕЦИАЛЬНОСТИ ДНЕВНОЙ ФОРМЫ ОБУЧЕНИЯ

### ЛИНГВИСТИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ МЕЖКУЛЬТУРНОЙ КОММУНИКАЦИИ

**(английский, немецкий, французский языки)**

***Срок обучения – 4, 5 года***

**Квалификация: Специалист по межкультурной коммуникации. Переводчик-референт.**

**Вступительные испытания: Белорусский (русский) язык (ЦЭ); иностранный язык (любой, ЦТ или ЦЭ); история Беларуси (ЦТ или ЦЭ).**

### РОМАНО-ГЕРМАНСКАЯ ФИЛОЛОГИЯ

***Срок обучения – 4 года***

**Квалификация: Филолог-переводчик. Преподаватель.**

**Вступительные испытания: Белорусский (русский) язык (ЦЭ); английский язык (ЦТ или ЦЭ); история Беларуси (ЦТ или ЦЭ)**

### ИСТОРИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ

***Срок обучения – 4 года***

**Квалификация: Преподаватель**

**Вступительные испытания: Белорусский (русский) язык (ЦЭ); всемирная история новейшего времени (ЦТ или ЦЭ); история Беларуси (ЦТ или ЦЭ).**

### БЕЛОРУССКАЯ ФИЛОЛОГИЯ

***Срок обучения – 4 года***

**Квалификация: Филолог. Преподаватель.**

**Вступительные испытания: Белорусский язык (ЦЭ); белорусская литература (устный экзамен, сдается в университете); история Беларуси (ЦТ или ЦЭ).**

## ФИЛОЛОГИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ.

1. **Русский язык и литература. Иностранный язык (английский)**

***Срок обучения – 4 года***

**Квалификация:** Преподаватель

**Вступительные испытания:** Русский язык (ЦЭ); Русская литература (устный экзамен, сдается в университете); английский язык (ЦТ или ЦЭ).

2. **Русский язык и литература. Иностранный язык (китайский)**

***Срок обучения – 4 года***

**Квалификация:** Преподаватель

**Вступительные испытания:** Русский язык (ЦЭ); Русская литература (устный экзамен, сдается в университете); иностранный язык (любой, ЦТ или ЦЭ).

*Наш адрес:* ***г. Витебск, Московский пр-т, 33, к. 603,604***
*Наши телефоны:* ***8 (0212) 3796 73 +375 33 317 95 06***
*Наш e-mail:* ***fgiyzk@vsu.by***
*Мы в Instagram:* ***@vsu.fhlc; tvu.vsu***
*Мы на сайте ВГУ имени П.М. Машерова:*
***https://vsu.by/universitet/fakultety/fakultet-gumanitaristiki-i-yazykovyh-kommunikacij.html***
*Мы в Telegram:*
***https://t.me/vsu_fhlc (Сделано на ФГиЯК);***
***https://t.me/vsumasherov (#ВГУмашерова)***

**ПОЛУЧИТЬ ИНТЕРЕСНУЮ И ПОЛЕЗНУЮ ПРОФЕССИЮ, СТАТЬ ТАЛАНТЛИВЫМ ПЕДАГОГОМ, КВАЛИФИЦИРОВАННЫМ ПЕРЕВОДЧИКОМ, СПЕЦИАЛИСТОМ В ОБЛАСТИ МЕЖКУЛЬТУРНЫХ КОММУНИКАЦИЙ И ВНЕШНЕЭКОНОМИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ, ГУМАНИТАРНЫХ НАУК, ОБРАЗОВАНИЯ, КУЛЬТУРЫ, СМИ**

**ВАМ ПОМОЖЕТ ФГИЯК**

# Зімой

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Узрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
У грудзях пачала кроў кіпець.

Максім Багдановіч

**Рэдакцыйная калегія часопіса:**
**Аксянчук Ганна Яўгенаўна —** кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры літаратуры;
**Бароўка Ванда Юльянаўна** — доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры літаратуры;
**Здольнікаў Віктар Віктаравіч** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры;
**Крыклівец Алена Уладзіміраўна** — доктар філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі;
**Лапін Іван Людвігавіч** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры літаратуры;
**Русілка Вольга Іванаўна** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Галоўны рэдактар часопіса:**
**Селязень Кацярына Яўгеньеўна** — студэнтка 4 курса ФГіМКа спецыяльнасці «Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)» ВДУ імя П.М. Машэрава.

ФГиЯК
ВГУ имени П.М. Машерова

***ФГиЯК – не отставать от времени!***

Тэлеграм канал факультэта:
t.me/vsu_fhlc

Кантакты для сувязі:
+375 (29) 559-20-67
kaczkanebarachka@yandex.by
(галоўны рэдактар часопіса)